№ 37 (587) 9 кастрычніка 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. АднОўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Вясковы экзыт-пол

Вёска ўпершыню падзяліла галасы напалам між лукашэнкаўцамі і апазыцыяй.

Старонка 5

## Дарагія мае вы Дразды!

8-соткавыя дзялкі пад забудову ў Драздах разьляцеліся па 700 мільёнаў рублёў.

Старонка 4

## Працуе выкладчыкам, зарабляе як тамада

Як пачалося? Яго сябры вырашылі пабрацца шлюбам і не знайшлі сабе беларускамоўнага тамаду.

Старонка 11

# Ці выстаяць беларускія банкі?

Золатавалютныя запасы Беларусі, разьлічаныя паводле стандартаў МВФ, за верасень скарацiліся на $460 млн. Гэта на 10 працэнтаў! Па стане на 1 кастрычніка яны склалі $4 120 млн, паведамляе Нацыянальны банк. Гэта першая статыстычная праява таго, што сусьветны фінансавы крызіс здольны драматычным чынам закрануць Беларусь, у прыватнасьці, яе фінансавы сэктар. Для параўнаньня, ЗВР Расіі ў аб'ёме $556,069 млрд у верасьні страцілі рэкордныя 4,4%, ці $25,569 млрд — рэкорд ад 1997 году.

У Расеі ўсё часьцей гучаць засьцярогі, што новы крызіс можа аказацца глыбейшым за дэфолт 1998 году. Як знак бяды, у сераду прыпынілі працу флагманы індустрыі — ГАЗ і КамАЗ. Прычына — рэзкае зьніжэньне попыту.

Трывога беларускага кіраўніцтва выявілася ў скліканьні А.Лукашэнкам адмысловае нарады з кіраўніцтвам КДБ па пытаньнях уплыву крызісу на Беларусь.

Ці адбудзецца дэвальвацыя рубля? Ці захаваюцца банкаўскія ўклады? Усё будзе залежаць ад таго, як доўга будзе трываць крызіс і наколькі сур'ёзна пацерпіць ад яго эканоміка Расеі, кажа эканаміст з Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту Зьміцер Крук. **Старонка 3.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Візыт Пуціна ў Беларусь прайшоў на фоне сусьветнага фінансавага крызісу.**

## Палітычны пасьянс — 2010

Найхутчэй, што наступныя прэзыдэнцкія выбары пройдуць пры канцы 2010 году ці на самым пачатку 2011 году. Такім чынам, да іх застаецца два гады. Апазыцыі пара вызначыцца, як яна мае ўдзельнічаць у гэтых выбарах і як і каго вылучаць. Сьпіс магчымых прэтэндэнтаў досыць шырокі, але, як паказвае практыка кампаній-1994, 2001 і 2006, колькасьць актывістаў дэмакратычнага руху ў краіне такая, што подпісы здольныя сабраць ня больш за два незалежныя кандыдаты. Зьміцер Панкавец прапануе кароткі аналіз шанцаў і пэрспэктыў магчымых прэтэндэнтаў. **Старонка 8.**

## У НУМАРЫ

**Аляксандар Стуб: «Веру ў супрацоўніцтва, а не ў ізаляцыю»**

Дзейны старшыня АБСЭ, міністар замежных спраў Фінляндыі прыляцеў у Беларусь на наступны дзень пасьля Пуціна. **Старонка 2.**

**Супэрлібэральны падаходны падатак**

уводзіцца ў Беларусі. Ён выгадны для багатых, павысіць падатковае абкладаньне бедных. **Старонка 4.**

**Распрацоўваецца найбуйнейшае ў Эўропе радовішча крэйды**

Канцэсію на яго атрымала фірма «Трайпл», якая пабудуе пад Маларытай тры новыя заводы па выпуску будматэрыялаў. **Старонка 4.**

**Міна запаволенага дзеяньня**

Выбух у Цхінвалі прымусіў успомніць пра выбух у Менску 4 ліпеня. **Старонка 5.**




**Распачалася кампанія пад лёзунгам «Будзьма беларусамі!» Старонка 7.**

**Баю-бай, старая «Калыханка»!**

Замест узвычаенай песьні Ядзьвігі Паплаўскай у эфіры тэлеканалу «Лад» будзе гучаць абсалютна новы твор у перакладзе з расейскай, у выкананьні Ірыны Дарафеевай. **Старонка 11.**

**Свабодны тэатар уразіў «Бандароўнай»**

А пад Новы год таленавітыя берасьцейскія самавукі хочуць паставіць «Працэс» Кафкі. Піша Пётра Васілеўскі. **Старонка 12.**

**Майстры прафэсіі**

«Спортивная панорама» перафарбавала сьцяг БАТЭ ў чырвона-зялёны. **Старонка 14.**

**Сяброўскія падарожжы**

**12 кастрычніка** фонд «Краіна Замкаў» ладзіць экскурсію «Дарога да храму». Маршрут вандроўкі пройдзе праз Будслаў, Глыбокае і Мосар. Даведкі праз т.: (017) 209-44-52, (029) 282-55-49, (029) 772-77-58. E-mail: zamak@tut.by



КАМЭНТАРЫ

## Вясковы экзыт-пол

Вёска ўпершыню падзяліла галасы напалам між лукашэнкаўцамі і апазыцыяй. Астатняе вызначалі выбарчыя камісіі. Піша Аляксандар Агееў з Магілёва.

Выбары ў парлямэнт. Вялыя і сумныя. Галасаваць не хочацца ні за каго. Але напачатку быў вырашыў праверыць, ці змагу прагаласаваць адразу ў двух месцах. Такой магчымасьці дужа баяліся прадстаўнікі ад АБСЭ перад выбарамі.

У Магілёве я жыву, а ў Мікіцінічах на роднай Шклоўшчыне зараз знаходзіцца бабуля і маці. Пасьпець і там, і там прагаласаваць цалкам рэальна. Адно пытаньне, ці дазволіць мне камісія дапамагчы кандыдату ад БНФ Рыгору Кастусёву, якога я ўжо колькі гадоў добра ведаю.

У дзень сьвята беларускай дэмакратыі недзе а дзясятай гадзіне я якраз скончыў пераворваць бульбу, пад'ехаў аўтобус з прадстаўнікамі выбарчай камісіі. Мая спроба сходу прагаласаваць завяршылася, трэба прызнаць, няўдачай. У сьпісы ні мяне, ні маці, якая прапісана ў Магілёве, не ўключылі.

«АБСЭ турбуюцца дарма», — вырашыў я. Але фраза членкі камісіі: «Можа вам лепей зьезьдзіць на ўчастак, пагаварыць з старшынём камісіі, мабыць ён нешта і вырашыць?» — пакінула пэўныя сумненьні ў чысьціні экспэрымэнту.

Працяг на старонцы 5.

# Аляксандар Стуб: «Я ня веру ў ізаляцыю, я веру ў супрацоўніцтва»

Дзейны старшыня АБСЭ, міністар замежных справаў Фінляндыі Аляксандар Стуб пасьля перамоваў зь беларускім калегам Сяргеем Мартынавым адказаў на некалькі пытаньняў журналістаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Аднак найперш слова на правах гаспадара ўзяў міністар Мартынаў. Ён зазначыў, што падчас перамоваў Аляксандра Стуба і ў МЗС, і з Аляксандрам Лукашэнкам былі абмеркаваныя далейшыя ўзаемадачыненьні з АБСЭ, а таксама іншымі эўрапейскімі арганізацыямі, у тым ліку з Эўрасаюзам. «Беларусь, АБСЭ і Эўрасаюз гатовыя адкрыць новую старонку ў стасунках, усе яны будуць працаваць у гэтых мэтах», — сказаў Мартынаў.

Яшчэ было закранутае пытаньне пра сустрэчу кіраўнікоў замежнапалітычных ведамстваў краін АБСЭ, якая 4—5 сьнежня пройдзе ў Хэльсынкі.

Аляксандар Стуб расказаў, што размову з Лукашэнкам ён пачаў з хакею, потым суразмоўцы перайшлі на больш сур'ёзныя тэмы.

«Місія АБСЭ зафіксавала паляпшэньне клімату падчас выбараў, але яны яшчэ не былі ідэальнымі. Падчас сустрэчы з кіраўніком Беларусі мы закранулі шэраг «далікатных пытаньняў» — сьмяротнае пакараньне, свабода сходаў, недзяржаўныя арганізацыі, а таксама выбары. Я ацэньваю тэндэнцыю ў нашых стасунках зь Беларусьсю як станоўчую і пазытыўную. Беларусь ідзе ў правільным кірунку. Яшчэ адной маёй задачай тут было падрыхтаваць справаздачу пра сытуацыю ў Беларусі для сваіх калег зь іншых краін Эўрасаюзу», — кажа А.Стуб.

Што датычыць адмены палітычных санкцый супраць беларускіх чыноўнікаў, то гэта пытаньне будзе разглядацца на наступнай сустрэчы міністраў замежных справаў ЭС, што пройдзе ў панядзелак.

«Эўрасаюз рыхтуе вывады па Беларусі. Многія пытаньні па-ранейшаму застаюцца адкрытымі. У прыватнасьці, спрашчэньне атрыманьня віз і забарона на выезд за мяжу. Пачакаем панядзелка», — гаворыць старшыня АБСЭ.

Міністар замежных справаў Фінляндыі таксама лічыць, што прыйшоў час па-новаму зірнуць на месца Беларусі ў сьвеце: «Я ня веру ў ізаляцыю, я веру ў супрацоўніцтва. Галоўнае, мы згодныя, што павінна быць адкрытая новая старонка супрацоўніцтва Беларусі і Эўрасаюзу».

Таксама Аляксандар Стуб меў сустрэчу з прадстаўнікамі беларускай апазыцыі і трэцяга сэктару. Па выніках візыту старшыні АБСЭ будзе вырашаца, ці ўнясуць нейкія праўкі ў выніковую справаздачу БДІПЧ АБСЭ.

**Зьміцер Панкавец**

СЬЦІСЛА

### У Беларусь не пусьцілі віцэ-старшыню ПАРЭ

Віцэ-старшыні Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Крыйсьціне Оюланд (Эстонія) беларускія ўлады адмовілі ў візе. Спадарыня Оюланд плянавала наведаць Беларусь і сустрэцца з прадстаўнікамі апазыцыі. Яна мяркуе, што якраз гэта і стала прычынай адмовы ва ўезьдзе ў краіну.

### 2010 год у Літве абвешчаны годам Грунвальдзкай бітвы

Сойм Літвы з мэтай ушанаваць гістарычную ваенную перамогу пад Грунвальдам абвясьціў 2010 г. Годам Грунвальдзкай бітвы. Парлямэнтарыі даручылі ўраду распрацаваць праграму Году. У яе павінны ўвайсьці агульныя мерапрыемствы Літвы і Польшчы. 15 ліпеня 2010 г. спаўняецца 600 гадоў бітве пад Дуброўнам.

### Агееў і Трусаў выдалі кнігу пра магілёўскую ратушу

Кніжка Аляксандра Агеева і Алега Трусава «Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэньне» адразу пасьля выданьня стала бібліяграфічнай рэдкасьцю. Замоўцы – гарадзкія ўлады Магілёва – маюць намер перавыдаць яе.

Адноўленая пасьля падрыву ў 1957 г. гарадзкая ратуша ў Магілёве была ўрачыста адчыненая сёлета 3 ліпеня.

### «Жданы» ў мастацтве

27 верасьня ў галерэі «Zнята», што ў менскім кінатэатры «Цэнтральны», адкрылася незвычайная выстава фота-дызайнаў «Wonderland. Артыкулы Поля Цудаў» мастака Артура Вакарава. Праект паўстаў з творчага пераасэнсаваньня вядомай «ждановіцкай» барахолкі.

**Паводле Радыё Свабода, «Эўрапейскае Радыё для Беларусі», БЕЛТА**

## Дзяды—2008

Два асобныя шэсьці ладзяць на Дзяды КХП-БНФ і Партыя БНФ. Партыя Пазьняка мае пачаць працэсію аб 11.00 ад Гадзіньнікавага заводу (ст.м. «Парк Чалюскінцаў»). Партыя БНФ заклікае сабрацца а 12.00 на Ўсходніх могілках, каб ускласьці кветкі да магілаў Быкава, Караткевіча, Карпенкі, Ткачова. Пасьля людзі скіруюцца вуліцай Каліноўскага і Лагойскім трактам да Курапатаў. Дзеячы інтэлігенцыі спадзяюцца, што па дарозе да Курапатаў дзьве калёны злучацца.

**МБ**

## Паўлічэнка больш не камандуе брыгадай спэцназу

Скандальна вядомы палкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка, які падазраецца ў датычнасьці да зьнікненьняў апазыцыйных палітыкаў Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадзкага, адхілены ад пасады. Як паведамілі выданьню крыніцы ў МУС, ён залічаны ў распараджэньне камандуючага Ўнутранымі войскамі.

Ужо вядома, што Трэцяй асобнай Чырвонасьцяжнай брыгадай спэцпрызначэньня войскаў МУС будзе камандаваць палкоўнік Юры Караеў, які зусім нядаўна быў прызначаны камандзірам Палка міліцыі спэцыяльнага прызначэньня. Хто ўзначаліць менскі амон, пакуль незразумела.

**СМ; паводле «Белорусский партизан»**



**Самай сэксуальнай жанчынай 2008 году, паводле вэрсіі часопісу Esquire, прызнана галівудзкая акторка і былая супэрмадэль Голі Бэры. «Я не зусім разумею, што гэта азначае, але мне 42 гады і я толькі што нарадзіла, таму я згодная», — пажартавала акторка. Голі Бэры пачала сваю кар'еру ў якасьці мадэлі і ў 1986 г. заваявала тытул «Міс ЗША», пазьней яна стала здымацца ў кіно. У 2000 г. атрымала прэміі «Эмі» і «Залаты глёбус» за галоўную ролю ў фільме «Пазнаёмцеся з Дораці Дэндрыдж». Посьпех таксама прынесла роль дзяўчыны Бонда ў фільме «Памры, але не цяпер» і ўдзел у трылёгіі «Людзі ІКС».**

## У менскіх школах пачалі працу падрыхтоўчыя клясы

У тым ліку ў беларускамоўных школах і гімназіях.

У гімназіі №23 ужо каторы год дзейнічае падрыхтоўчая кляса «Маладзічок». Навучаньне тут платнае. Першы занятак зладзілі 1 кастрычніка, але запісацца яшчэ не позна. Як і ў гімназіі №4 (Кунцаўшчына). Платныя заняткі ў падрыхтоўчых клясах прапануюць гімназіі №14 у Васьнянцы і №28 у Серабранцы. Школа №60 на Лібкнехта пакуль толькі плянуе стварыць такія клясы.

Адрасы школаў зь беларускай мовай навучаньня:

Гімназія №4 (вул. Кунцаўшчына, 18).
Гімназія № 14 (вул. Васьнцова, 10).
Гімназія № 9 (Сядых, 10).
Гімназія №23 (пр. Незалежнасьці, 45).
Гімназія № 28 на базе сярэдняй школы № 2 (Ракасоўскага, 93).
Школа № 60 (Лібкнехта, 82).

**Сямён Печанко**

# Хваля крызісу набліжаецца да Беларусі

Золатавалютныя запасы Беларусі, разьлічаныя паводле стандартаў МВФ, за верасень скараціліся на $460 млн. Гэта на 10 працэнтаў! Па стане на 1 кастрычніка яны склалі $4 120 млн, паведамляе Нацыянальны банк. Гэта першая статыстычная праява таго, што сусьветны фінансавы крызіс здольны драматычным чынам закрануць Беларусь, у прыватнасьці, яе фінансавы сэктар. Для параўнаньня, Золатавалютныя запасы Расеі ў аб'ёме $556,069 млрд у верасьні страцілі рэкордныя 4,4%, ці $25,569 млрд — рэкорд ад 1997 году.

У Расеі ўсё часьцей гучаць засьцярогі, што новы крызіс можа аказацца глыбейшым за дэфолт 1998 году. Як знак бяды, у сераду прыпынілі працу флагманы індустрыі — ГАЗ і КамАЗ. Прычына — рэзкае зьніжэньне попыту.

Трывога беларускага кіраўніцтва выявілася ў скліканьні А.Лукашэнкам адмысловае нарады з кіраўніцтвам КДБ па пытаньнях уплыву крызісу на Беларусь.

Першай ластаўкай сусьветнага фінансавага крызісу стаў іпатэчны крызіс у ЗША пры канцы 2006 г. (іпатэка — пабудова жытла ў крэдыт пад заставу будаванага жытла ці іншае нерухомасьці.) Расійскі фінансавы аналітык Ігар Мікалаеў лічыць, што асноўнай яго прычынай было тое, што капіталізацыя фондавых рынкаў была вышэйшай за рэальны ўзровень разьвіцьця эканомікі. Прыкладам кажучы, за акцыі «Газпрому» на спэкулятыўнай хвалі плацілі нашмат больш, чым кампанія здольная даваць прыбытку. І так з усімі прадпрыемствамі, выстаўленымі на адкрыты рынак. «Для ацэнкі выкарыстоўваўся паказьнік «капіталаёмістасьці ВУП», — кажа Мікалаеў. — Гэта сукупная капіталізацыя ўсіх кампаній дзяржавы падзеленая на аб'ём яе ВУП. Гэта можна ўжыць і да сусьветнага ВУП, і да сусьветнай капіталізацыі. Паказьнік капіталаёмістасьці ВУП усё ХХ ст. трымаўся на ўзроўні 40—60%. Рэзкі рост пачаўся пры канцы 90-х, да 1999 г. дасягнуў 118%. Пасьля быў магутны спад у сусьветнай эканоміцы на мяжы ХХ—ХХІ ст. У 2002 г. капіталёмістасьць упала да 73%, а ў 2007 г. зноў дарасла да 122%. То бок яўна «зашкаліла». І ў 2008 г., паводле прагнозаў, мы зьнізімся амаль на 40 пунктаў — да 83%.

Такім чынам, існуе нейкі парог, пасьля якога абавязкова пачынаецца абвал. Іпатэчны крызіс у ЗША быў толькі каталізатарам. Не было б яго — было б нешта іншае», — лічыць І.Мікалаеў.

На сусьветных біржах працягваецца падзеньне каціровак акцый. Індэкс вядучых амэрыканскіх кампаній Dow Jones упаў у аўторак да новага пяцігадовага мінімуму 9447,11 пункты. Інвэстары непакояцца, што працяглы фінансавы крызіс можа справакаваць сур'ёзнае запавольваньне сусьветнай эканомікі. У ЗША каціроўкі рэзка пайшлі ўніз пасьля таго, як кіраўнік Фэдэральнай рэзэрвовай сыстэмы Бэн Бэрнанке заявіў, што сытуацыя ў амэрыканскай эканоміцы можа пагоршыцца. Ён прадказаў рост беспрацоўя зь цяперашніх 6 да 10 працэнтаў. А варта сказаць, што зьніжэньне эканамічнага росту ў ЗША на кожны пункт вядзе да падзеньня экспарту з Кітаю на паўпункту і гэтак ланцужком далей.

У Токіё біржавы індэкс Nikkei зьнізіўся больш чым на 9%. Асноўны індэкс Франкфурцкай біржы ў сераду ўпаў на 5%. Расейскія фондавыя біржы ўвогуле ня раз прыпынялі таргі з прычыны новых абвалаў. Расейскі ўрад тэрмінова вылучыў яшчэ 900 млрд рублёў на выратаваньне банкаў, што трапілі ў крэдытныя пасткі.


WALL STREET JOURNAL

Прэсавы сакратар Нацыянальнага банку Міхаіл Журавовіч у размове з радыё «Свабода» сказаў, што «сусьветны фінансавы крызыс толькі часткова закрануў Беларусь»: «Расейскія банкі-нерэзыдэнты пачалі даваць менш валюты на наш унутраны валютны рынак. Гэта тычыцца, прыкладам, ВТБ, БелРосбанку, Белгазпрамбанку ды некаторых іншых. І калі раней яны завозілі валюту да нас з Расеі, дык цяпер вымушаны купляць яе ў самой Беларусі. Вось толькі гэтак нас закрануў фінансавы крызіс.

Беларускія банкі пачалі ствараць «падушку бясьпекі» для падтрыманьня ліквіднасьці. Гэта значыць, каб былі рэсурсы для абслугоўваньня сваіх кліентаў. Эўра, як вядома, вагаецца».

Прычынай такой «слабай адчувальнасьці» да сусьветнага фінансавага крызісу экспэрт газэты «Белорусы и рынок» Ірына Крыловіч лічыць «не высокую ўстойлівасьць беларускай эканамічнай мадэлі, а мінімальную інтэграванасьць у сусьветную фінансавую сыстэму».

І ўсё адно фактычная адсутнасьць у Беларусі фондавага рынку ад крызісу не ратуе: «Сёньня банкаўская сыстэма мацуецца за кошт замежных інвэстыцый у розьнічны сэктар. Але ці бясьпечны для банкаўскай сыстэмы «спажывецкі бум» ва ўмовах усё таго ж сусьветнага крызісу. Бо і просты ўкладчык, і крэдытаатрымальнік вельмі адчувальныя да зьмены курсаў валют і ставак.

Хто сёньня можа ўзяць крэдыт на кватэру ці дарагі аўтамабіль? Толькі той, хто мае прыбыткі вышэй за сярэднія. Зазвычай гэта людзі, бізнэс якіх завязаны на замежныя рынкі. Ці ўтрымаецца гэты бізнэс, калі фінансавы крызіс на нашых традыцыйных экспартных і імпартных рынках будзе паглыбляцца?» — непакоіцца І.Крыловіч.

## Ці выстаяць беларускія банкі?

Ці адбудзецца дэвальвацыя рубля? Ці захаваюцца банкаўскія ўклады?

Магчымыя наступствы сусьветнага фінансавага крызісу для беларускай эканомікі аналізуе эканаміст Дасьледчыцкага цэнтру Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту Зьміцер Крук.

«Скарачэньне золатавалютных запасаў Беларусі (ЗВЗ) у пэўнай ступені ёсьць праявай наступстваў сусьветнага фінансавага крызісу, аднак ня варта перабольшваць значэньне гэтай зьявы, бо памер ЗВЗ увесь час зьмяняецца», — мяркуе эканаміст Зьміцер Крук.

На яго думку, усё будзе залежаць ад таго, як доўга будзе трываць крызіс і наколькі сур'ёзна пацерпіць ад яго эканоміка Расеі, зь якой мы маем надзвычай шчыльныя гандлёвыя сувязі. Важным фактарам ёсьць цэны на нафту — іх падзеньне адаб'ецца і на нашай эканоміцы.

Банкаўская сыстэма Беларусі напэўна не зазнае тых клопатаў, што займелі нашыя суседзі, бо ўзровень запазычваньняў у замежных банкаў досыць невысокі, а выхад на сусьветныя банкі дастаткова абмежаваны, што натуральна для краіны, эканоміка якой разьвіваецца.Не пацерпяць, прынамсі, бліжэйшы год, і шараговыя ўкладчыкі, лічыць эканаміст: «У банках цудоўна разумеюць, што любыя прыкметы пагрозы могуць справакаваць масавы адток дэпазытаў, таму там зробяць усё магчымае, каб пазьбегнуць панікі».

У любым разе, падкрэсьліў З.Крук, Беларусь мае дастаткова ізаляваную ад замежных уплываў фінансавую сыстэму, таму на нашую эканоміку сусьветны фінансавы крызіс акажа заўважны ўплыў толькі ў тым выпадку, калі будзе трываць больш за год.

**Запісаў Сямён Печанко**

## На вуснах мёд, у сэрцы лёд

Пуцін прапанаваў сфармаваць валютны пул зь Беларусьсю і пашырыць разьлікі ў расейскіх рублях.

Крыніца ва ўрадзе Расеі адначасова заявіла, што Масква гатовая падпісаць дамову пра адзіную групоўку СПА да канца году. Такімі сталі самыя яркія моманты беларуска-расейскіх перамоваў у сталіцы Беларусі ў панядзелак. Агенцтва БЕЛТА ні словам не згадала пра ўсё гэта.

Затое агенцтва шчодра цытуе выказваньні А. Лукашэнкі наконт таго, што «саюзным адносінам Расеі і Беларусі неабходна надаць дадатковы імпульс».

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін заявіў, што Расія гатова аказваць Беларусі неабходную падтрымку, у тым ліку падтрымку беларускай фінансавай сыстэмы. Апошняе прагучала актуальна ў сьвятле фінансавага крызісу, хвалі якога дакаціліся да Расеі і вось-вось будуць у Беларусі.

За ўсімі гэтымі турботамі Ўладзімер Пуцін не забыўся павіншаваць Аляксандра Лукашэнку зь нядаўна праведзенымі парлямэнцкімі выбарамі: «Паводле нашых ацэнак яны прайшлі на высокім арганізацыйным і палітычным узроўні. Упэўнены, што мы зможам і ў далейшым пасьпяхова вырашаць усе пытаньні, якія ўзьнікаюць у адносінах Расеі і Беларусі, як на ўзроўні выканаўчай улады, так і заканадаўчай».

Як кажа расейская байка, зязюля хваліць пеўніка.

**Мікола Бугай**

## Падлічваць галасы — гэта прыніжэньне беларускага народу

Галоўная тэма сустрэчы Лукашэнкі з кіраўніцтвам КДБ 7 лістапада прагучала абсалютна ясна: сусьветны фінансавы крызіс можа ўдарыць і па Беларусі. Лукашэнка абараняў мадэль дзяржаўнага кантролю над эканомікай і нечакана даручыў КДБ невырашальную задачу змаганьня з крызісам. Лукашэнка таксама акцэнтаваў, што пасьлявыбарная сытуацыя адкрывае новыя магчымасьці для дыялёгу з Захадам і адначасова выдаў новы пэрл пра «прыніжэньне народу».

Найважнейшай умовай дынамічнага разьвіцьця Беларусі зьяўляецца захаваньне стабільнасьці ў грамадзтве, а таксама ўстойлівасьці эканомікі ва ўмовах сусьветнага фінансавага крызісу. Аб гэтым заявіў Аляксандар Лукашэнка 7 кастрычніка наведваючы Камітэт дзяржаўнай бясьпекі, паведамляеБЕЛТА.

Эканамічная сытуацыя ў сьвеце характарызуецца нарастаньнем крызісных зьяваў. Паводле словаў А.Лукашэнкі, расейскія экспэрты прагназуюць абвалы фінансавага рынку на працягу ўсяго наступнага году. Закране гэта ў некаторай ступені і Беларусь: ня выключана, што стане больш складана прадаваць тавары на экспарт.

«І перад намі стаіць задача выстаяць што б там ні было», — падкрэсьліў кіраўнік дзяржавы.

**Працяг на старонцы 9.**

## Расея ўратуе Ісьляндыю ад краху

4 млрд эўра могуць быць выдаткаваныя на ўмовах значна больш выгадных, чым тыя, што прапануюцца расейскім карпарацыям.

Ісьляндыі грошы патрэбныя: яе ўлады нацыяналізуюць праблемныя банкі і гарантуюць ўклады грамадзян. Якія дывідэнды такая шчодрасьць прынясе Расеі? Палітычныя.

Расея прадставіць Ісьляндыі крэдыт на чатыры гады ў памеры 4 млрд эўра. Атрыманыя сродкі павінны будуць павялічыць міжнародныя рэзэрвы ісьляндзкага Цэнтрабанку і ўзмацняюць стабільнасьць абменнага курсу нацыянальнай валюты, адзначаецца ў паведамленьні рэгулятара. Праз сусьветны крызіс курс ісьляндзкай кроны зьнізіўся амаль на трацінy.

Раней Цэнтрабанк Ісьляндыі сьцьвярджаў, што рашэньне аб выдзяленьні крэдыту ўжо прынятае, умовы — LIBOR плюс 0,3—0,5% гадавых.

Ісьляндыя атрымае дапамогу ад Расеі на выгадных умовах. Айчынным кампаніям расейскія ўлады зьбіраюцца даваць грошы для барацьбы з крызіснымі зьявамі пад значны большы працэнт. Справа не ў эканоміцы.

«Цалкам магчыма, што гэта стварэньне выгадных палітычных умоваў для будучай распрацоўкі арктычнага шэльфу. Акрамя таго, Ісьляндыя ўваходзіць у НАТО», — адзначае начальнік аддзелу рынкавай аналітыкі ФК «Открытие» Валеры Півень. Гэта свайго роду іміджавая зьдзелка, сыходзяцца ў меркаваньнях экспэрты.

Ісьляндзкі ўрад выключыў магчымасьць выкарыстаньня базаў на востраве расейскімі вайскоўцамі як варыянт платы за фінансавы паратунак.

**НБ паводле матэрыялаў gazeta.ru**

# Беларусь распрацоўвае найбольшае ў Эўропе радовішча крэйды

Канцэсію на яго атрымала фірма «Трайпл», якая пабудуе тры заводы па выпуску будматэрыялаў.

Пад Маларытай, што на Берасьцейшчыне, зьявяцца тры заводы па вытворчасьці ячэйкавага бэтону, сылікатнай цэглы і дыспэрснай крэйды. Яны будуць належаць кампаніі «Трайпл».

Хаціслаўскае крэйдавае радовішча лічыцца найбуйнейшым у Эўропе. Пэрспэктыўныя запасы мясцовай крэйды складаюць 215,8 млн. т. Тут ёсьць і запасы будаўнічага пяску, якія складаюць каля 50 млн кубамэтраў. Хаціслаўская крэйда адносіцца да І-га гатунку — чысьціня складае 96%. Са словаў старшыні Маларыцкага райвыканкаму Казіміра Лапіча, у будучыні новыя прадпрыемствы дадуць да тысячы дадатковых працоўных месцаў, істотна падвысяць паступленьні ў мясцовы бюджэт. На агульнадзяржаўным узроўні прыбытак ад крэйды можа параўнацца з даходамі ад «Беларуськалію».


VB.BY
Хаціслаўскае радовішча.

Расейская «Ітэра» можа атрымаць крэйдавыя радовішчы пад Добрушам, а нямецкі канцэрн Knauf цікавіцца радовішчам гіпсу «Брынёўскае».

Хаціслаўскае радовішча не адзінае, што аддаюць у канцэсію. Згодна з указам №44 «Аб зацьвярджэньні пераліку аб'ектаў, прапанаваных для перадачы ў канцэсію» ад 26 студзеня 2008 г., разглядаюцца радовішчы жалезных рудаў «Навасёлкаўскае» (Карэліцкі раён, Гарадзеншчына) і «Аколаўскае» (Стаўпецкі, Меншчына), бэнтанітавых глінаў «Астражанскае» (Лельчыцкі, Гомельшчына), радовішча гіпсу «Брынёўскае» (Петрыкаўскі, Гомельшчына). Апошнім, паводле СМІ, цікавіўся нямецкі канцэрн Knauf. Раней паведамлялася і пра магчымае набыцьцё расейскай «Ітэрай» крэйдавых радовішчаў пад Добрушам.

Холдынг «Трайпл» займаецца будаўнічымі, праектнымі і дызайнэрскімі працамі, выраблае будаўнічыя канструкцыі з ПВХ-профіляў, алюмінію і дрэва. Таксама кампанія гандлюе нафтапрадуктамі, займаецца міжнароднымі аўтагрузаперавозкамі, вытворчасьцю безалькагольных напояў і піва. Дзейнічае з 1992 г. Кіраўнік кампаніі — бізнэсовец Юры Чыж, які, да ўсяго, зьяўляецца старшынём праўленьня менскага футбольнага клюбу «Дынама».

**Сямён Печанко**

# Супэрлібэральны падаходны падатак

Выгадны для багатых, адаб'ецца на незаможных.

Парлямэнт у першым чытаньні прыняў законапраект пра адзіную стаўку падаходнага падатку. Яе маюць увесьці ад 2009 г. Ініцыятыва сыходзіць ад А.Лукашэнкі.

Падатак будзе адзін для ўсіх катэгорый насельніцтва і складзе 12% ад заробку. Цяпер у Беларусі існуе дыфэрэнцыяваны падатак: ад 9% да 30%. У сярэднім, паводле статыстыкі, працэнт складаў 12,6. Такім чынам, сярэдняя падатковая нагрузка трохі зьнізіцца. Эканамісты лічаць, што розьніца кампэнсуецца за кошт выхаду зь ценю часткі даходаў багацеяў.

Міністар фінансаў Андрэй Харкавец, які прадставіў праект закону дэпутатам, сказаў, што мяркуецца ўвесьці і адзіны памер падатку для прадпрымальнікаў: 15%. Паводле А.Харкаўца, цяпер яны плацяць каля 16,3% ад заробку.

Людзі з вышэйшымі даходамі ці тыя, хто атрымлівае іх зь некалькіх крыніцаў, паводле новай сыстэмы стануць плаціць менш. Урадавыя эканамісты спадзяюцца, што дзякуючы гэтаму больш людзей стане дэкляраваць даходы. А Беларусь стане выгадным месцам жыцьця для багатых.

Тыя ж, чые даходы не перавышаюць сярэдняга заробку, хто жыве з адной зарплаты, стануць плаціць крыху больш.

Новы закон выводзіць Беларусь у шэраг самых прарынкавых краінаў па сыстэме падаходнага падатку.

**МБ**

### Эканаміст Аляксандар Чубрык: Выгадна ўсім

Эканаміст Аляксандар Чубрык мяркуе, што ў сярэдняй і доўгатэрміновай пэрспэктыве ўвядзеньне адзінай стаўкі падаходнага падатку паспрыяе ўсім катэгорыям насельніцтва.

У мінулым годзе эфэктыўная стаўка падаходнага падатку для беларусаў зь сярэднімі даходамі складала каля 12,6%, таму больш заможныя грамадзяне і тыя, хто адносіцца да сярэдняй клясы, толькі выйграюць ад такога кроку.

Менш забясьпечаныя суайчыньнікі, якія плацілі падатак на ўзроўні 9% у першы час сапраўды могуць адчуць на сабе ініцыятыву ўраду. Аднак, як адзначае эканаміст, апошнія гады заробкі ўсяго без выключэньня насельніцтва растуць. Таму, калі б захаваўся стары дыфэрэнцыяваны падатак, з ростам заробкаў беларусам давялося б плаціць большыя падаткі.

У ідэале дзяржава магла б скарыстацца з дадатковых паступленьняў, каб аказваць адрасную дапамогу самым неабароненым катэгорыям насельніцтва.

**Запісаў СП**

## Лідзкі бровар прадалі фінам

На піўным рынку зьявіўся трэці замежны інвэстар: фінская OLVI.

Фінская кампанія OLVI набыла кантрольны пакет акцыяў у ААТ «Лідзкае піва» за 16 млн даляраў. 49% акцый застанецца ва ўласнасьці працаўнікоў. На актывы бровару прэтэндаваў і канцэрн Heineken, які валодае бабруйскай півапарняй «Сябар» і «Рэчыцапівам».

Яшчэ адным буйным інвэстарам у піваварную галіну зьяўляецца група Carlsberg/BBH. У 2006 г. яна набыла 30% акцыяў «Аліварыі».

Пад кантролем дзяржавы застаюцца «Крыніца» (40% рынку) і «Берасьцейскае піва».

Лідзкая піваварня пабудаваная ў 1876 г. Акцыянаванае — у 2000-м. Па выніках першага паўгодзьдзя ААТ «Лідзкае піва» займае 4-е месца ў краіне (12,5% рынку).

Фінская кампанія OLVI 5 кастрычніка адзначыла 130-годзьдзе. Мае заводы ў Эстоніі, Латвіі і Літве. Акрамя асноўных брэндаў піва OLVI і Sandels, выраблае энэргетычныя і безалькагольныя напоі, мінэральную ваду.

**СП**

# Дарагія мае вы Дразды!

8-соткавыя дзялкі зямлі пад забудову ў Драздах разышліся за 700 мільёнаў.


RC.BY
**Няхай вас не палохае выгляд: за гэтую хатку ў Зацані просяць 220 тыс. у.а.**

У нашай краіне ўсё большае багатыроў, здольных выкласьці сотні тысячаў даляраў за ўчастак зямлі ў добрым месцы пад Менскам. Зірнем на выніку верасьнёўскіх аўкцыёнаў па продажы зямельных надзелаў. Напрыклад, пад малапавярховую забудову ў межах пр.Пераможцаў — праезду Дразды — р.Сьвіслач.

Пры стартавых коштах ад 180 млн рублёў пляцы ў 8—10 сотак разыходзяцца за 660—770 млн.

Зямля імклівa даражэе і ў ваколіцах Менску.

Возьмем, да прыкладу, Зацань. На адным з рыэлтэрскіх сайтаў можна пабачыць здымкі як ужо збудаваных «палацаў», так і ўрослых у траву халупаў. Але няхай вас ня страшыць выгляд пахіленых баракаў: яны каштуюць 200 і болей тысячаў даляраў.

У рэгіёнах зямелька пакуль не такая дарагая. Тут, відавочна, усё залежыць ад месца. Так, у Берасьцейскім раёне ў вёсцы Чэрні участак плошчай 11 сотак набылі за 27 млн, а на курортнай Браслаўшчыне ўчасткі па 24 сотак пайшлі за 70 мільёнаў.

На Магілёўшчыне і Гомельшчыне самыя дарагія ўчасткі з прададзеных на аўкцыёнах каштавалі ня больш за 7 млн, а вакол сталіцы самы дарагі раён, натуральна, Менскі — ад 30 да 300 млн руб. (Сеньніца) за ўчасткі 10 да 25 сотак. Далей ідуць Дзяржынскі і Смалявіцкі раёны.

Варта адзначыць, што ёсьць у Беларусі куткі, дзе пад пабудову дому ўсё яшчэ можна набыць участак зямлі за сьмешныя грошы — якія 100—150 тыс. рублёў. А бываюць аўкцыёны, на якіх стартавы кошт ад выніковага адрозьніваецца ў дзясяткі разоў — прасілі за тыя чвэрць гектару 125 тысячаў, а прадалі амаль за 10 мільёнаў.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Бюджэт на 2009 год прыняты ў першым чытаньні

Прыняты праект бюджэту краіны на 2009 г. у першым чытаньні. Даходы кансалідаванага бюджэту прагназуюцца ў аб'ёме Br72,7 трлн, або 46,9% да ВУП, выдаткі складуць Br75,5 трлн, або 48,7%. Прыярытэтнымі кірункамі выдаткаваньня сродкаў будуць забесьпячэньне росту заробкаў у бюджэтнай сфэры, забесьпячэньне дадатковых выдаткаў бюджэту ў сувязі з павелічэньнем цэнаў на імпартныя энэрганосьбіты.

Даходы рэспубліканскага бюджэту ў 2009 годзе прадугледжваюцца ў суме Br54,9 трлн, выдаткі — Br57,7 трлн.

### Бюджэтнікам сказалі пачакаць

Тарыфную стаўку I разраду падвысяць ня з 1 кастрычніка, як паведамлялася, а зь 1 лістапада. Цяпер яна складае Br73 тыс., апошні раз стаўку падвышалі на 4,3% у красавіку. Цяпер яна мусіла ўзьняцца на 21% (да 91 тыс. руб.).

### Шапікі яшчэ могуць вярнуцца

Менгарвыканкам не выключае такі варыянт, гаворыцца ў адказе на зварот прадпрымальнікаў, чые шапікі трапілі пад знос. Аднак спачатку пройдзе аўкцыён на арэнду адпаведных зямельных надзелаў.

### Імпарцёраў алькаголю паболела

Міжведамасная камісія падвяла вынікі адкрытага конкурсу на права займацца імпартам алькагольнай прадукцыі па сьнежань 2008 г. Сьпіс пашырыўся зь 15 да 24 арганізацыяў. Сярод імпарцёраў алькаголю УП «Менскі халадакамбінат № 1», ААТ «Берасьцейская база «Бакалея», УП «Дыяконія», зьвязаная з царквой, РУП «Менск Крышталь», УП «ДОРОРС» чыгункі.

### Болей рэйсаў у Эміраты

Эміратская авіякампанія Etihad Airways заявіла, што пашырыць з кастрычніка авіязлучэньні паміж Менскам і Абу-Дабі да трох рэйсаў у тыдзень.

**СП; паводле bsb.by, naviny.by**

# Вясковы экзыт-пол

**Працяг са старонкі 2.**

Тутака вызначылася іншая праблема — маёй бабулі не аказалася ў сьпісах выбаршчыкаў. Іх ніхто вывяраць перад выбарамі, натуральна, не стаў. А па разліках камісіі 89-гадовая бабуля павінна была ўжо сысьці ў лепшы сьвет. Члены камісіі, да іх гонару, не сталі гэтага ёй тлумачыць, а выдалі бюлетэнь суседкі, якой не аказалася дома, і паабяцалі ўнесьці маю бабулю ў сьпіс на ўчастку пазьней. Але трэ было бачыць іхняе зьдзіўленьне, калі яна прагаласавала за апазыцыянэра Рыгора, а не за старшыню Шклоўскага выканкаму Іванова. Тут я вінаваты! Мая тлумачальная работа падзейнічала.

Старшая зь дзьвюх членак хутка перастроілася і сказала, што паколькі бабушкі яшчэ няма ў сьпісах, то бюлетэнь яны ў скрыню кінуць пазьней, калі яе зарэгіструюць, і, пакуль мы перавару́алі сказанае, дзеўкі сышлі з хаты. Што яны з голасам бабулькі зрабілі ў выніку, ведаюць толькі яны самі і пан Бог.

Правакацыя мая не ўдалася. Ехаць у суседнюю вёску не было калі.

Павёў каня да суседа і ля калёнкі выведаў увесь палітычны расклад вёскі.

Высьветлілася, што ні прыўладнага, ні апазыцыйнага кандыдата ў вёсцы ніхто ня бачыў. Два калгасьнікі прагаласавалі за старшыню райвыканкаму Іванова.

На маё пытаньне «Чаму?», адказалі катэгарычна: «Ну не за апазыцыянэра ж галасаваць! Нам аб ім ў канторы расказвалі…».

Дзьве пэнсіянэркі, як не дзіўна, галасавалі за апазыцыянэра. «Чаму?» Таму, што «мы пісалі, а начальства дарогу ў вёсцы не адрамантавала.

Бюракратаў гэтых трэба кожны год мяняць, пакуль яны не… сапсаваліся (тутака было натуральна іншае слова, якое сутнасьці не мяняе)».

Хто ж з двух кандыдатаў перамог? Астатнія нікіцінскія выбарцы адмоўчваліся.

Як часьцяком і бывае, маўклівая большасьць, якая склала каля паловы апытаных, сыграла вырашальную ролю ў выбарах кандыдата. Выдавала таямніцу свайго галасаваньня яна павольна, пасьля маіх настойлівых захадаў і цярплівага чаканьня шчырасьці.

Тыпова растлумачыў працэс галасаваньня сусед Стас. Ён стандартны вясковы мужык. Выгнаны гарадзкой жонкай за п'янкі, ужо даўно атабарыўся ў вёсцы. Ужо тры месяцы атрымоўвае пэнсію. Да гэтага гады тры натуральна галадаў, а заробленае ад безвыходнасьці прапіваў. Суседзі год назад білiся аб заклад, праз колькі месяцаў ён пры наяўнасьці грошаў ад перапою памрэ. Большасьць давала два месяцы, і на пагост. Не! Пакуль ён трымаецца. Нават дровы на зіму набыў, прыдбаў каляровы тэлевізар. Каб усё не прапіць, частку пэнсіі аддае маёй мамцы, а потым забірае.

Стас хваліўся, што пэнсіі даюць яму цяпер трыста тысяч: «Ня многа, але болей і ня трэба». Я напачатку яго развагі не разумеў: «Чаму гэта болей не трэба?» Сусед задумваўся, часаў патыліцу, а затым казаў: «Не, больш ня трэба». Не адразу, але да мяне дайшла прычына ягонага мінімалізму: на вышэйку пэнсіі хапае, але грошаў і ня так шмат, каб упіцца да сьмерці. Давалі б 600 тысяч — дык Стас бы дакладна і памёр, бо ня змог бы выйсьці з запою. А так у яго штомесяц апошнія дзён 10 здараецца лячэбнае галаданьне праз адсутнасьць грошай, а пасьля атрыманьня пэнсіі — чарговая рэляксацыя.

Вось аказваецца, які разумны наш прэзыдэнт і ягоны ўрад! Выбралі залатую сярэдзіну, бо ведаюць свой народ. Адсюль і папулярнасьць іхняя. Зласьліўцы, праўда, кажуць што задавальняюцца толькі самыя мізэрныя і нізкія патрэбы.

Але ж выбары паказалі рацыю ўраду.

Вінавата гледзячы на мяне, сусед выціснуў зь сябе прызнаньне:

«Я ім кажу: нікога з кандыдатаў ня ведаю, пакажыце мне за каго галасаваць». — «А яны?» — «Яны мне Іванова і паказалі. Сказалі, што ён у нас галоўны кандыдат».

Стас, як толькі стаў атрымоўваць пэнсію, пачаў больш упэўнена глядзець на свет, але не на начальства.

Што ў выніку? Вёска. Усход. Самы антыапазыцыйны электарат. І тым ня менш, за Кастусёва, хай сабе і ў знак пратэсту, прагаласавала 20—30% выбарцаў. Столькі ж набраў і афіцыйны кандыдат. А «нэўтральныя» члены вясковай камісіі ненавязьліва вызначылі вынік выбараў праз беларускае «балота».

*Магілёў*



PHOTO BYMEDIA.NET

Вёска ўпершыню падзяліла галасы напалам між лукашэнкаўцамі і апазыцыяй.

# Міна запаволенага дзеяньня

Выбух у Цхінвалі прымусіў успомніць пра іншы выбух, які адбыўся ў Менску ўначы на 4 ліпеня. Піша **Віталь Тарас**.

### «Гэты почырк нам добра знаёмы...»

Кажуць, тэрарызм ня змог бы доўга існаваць бяз сродкаў масавай інфармацыі. Які сэнс у тэракце, калі пра яго не даведаюцца мільёны людзей? З другога боку, што газэты выносілі б у шапкі на першых палосах, а тэлеканалы паказвалі б пад рубрыкаю breaking news? У сваю чаргу, улады, якія заклапочаныя змаганьнем з тэрарызмам і якія старанна хаваюць факты ад СМІ, з посьпехам выкарыстоўваюць і тэрор, і інфармацыю пра яго ў сваіх палітычных мэтах. Прычым робяць гэта часам з прасталінейнасьцю сякеры.

3 кастрычніка ў цэнтры Цхінвалі выбухнуў аўтамабіль. У выніку загінулі 11 чалавек, сярод якіх быў і начальнік Штабу аб'яднаных сілаў па падтрыманьні міру ў зоне канфлікту Іван Петрык. На пачатку паведамлялася пра дзьве аўтамашыны УАЗ, канфіскаваныя асэтынскімі ваяўнікамі ў адным з грузінскіх сёлаў, якія абязьлюдзелі падчас вайны. Пры гэтым сьцьвярджалася, што машыны забралі ў нейкіх падазроных асобаў «невядомай нацыянальнасьці» без дакумэнтаў, якіх адпусьцілі. Потым выявілася, што машына — «Жыгулі» (ВАЗ 2109), проста стаяла ў двары аднаго з дамоў. Яе ў асэтынскіх марадзёраў пазьней канфіскавалі расейскія вайскоўцы і прывезьлі ў Цхінвалі, дзе прыпаркавалі ля будынку штабу міратворцаў.

Увявеце сабе падступнасьць грузінскіх спэцслужбаў, якія спрагназавалі, што расейцы паставяць замінаваны аўтамабіль акурат пад вокнамі начальніка свайго штабу. Але ж 20 кілаграмаў тратілу, кажучы па-расейску, «ня фунт ізюму». Як такую колькасьць выбухоўкі ніхто не заўважыў? Шукаць адказ на гэтае пытаньне няма сэнсу.

Кіраўніцтва Паўднёвай Асэтыі ведала аб тым, хто арганізаваў тэракт, загадзя. Эдуард Какойты адразу абвінаваціў у тэракце грузінскія спэцслужбы. «Гэты почырк нам добра знаёмы», — заявіў ён. Расейская пракуратура вэрсію падтрымала.

Далей — болей. У панядзелак адзін з паўднёваасэтынскіх чыноўнікаў паведаміў, што канфіскаваныя аўтамабілі (у новай вэрсіі іх зноў стала некалькі) ехалі… у калёне АБСЭ. І ў машынах, нібыта, былі знойдзеныя зброя і выбухоўка! А за рулём былі, натуральна, грузіны, пра што сьведчылі пашпарты зламысьнікаў… Абсурд, як бачым, узмацніўся.

Навошта Грузіі была патрэбная падобная правакацыя ў момант, калі Расея пачала ліквідаваць свае блёк-пасты ў так званай «буфэрнай зоне», куды пачалі прыбываць назіральнікі АБСЭ ў адпаведнасьці з плянам Мядзьведзева—Сарказі? Паводле кіраўніцтва Паўднёвай Асэтыі і Расеі — відаць, проста таму, што гэта Грузія. То бок, па вызначэньні.

> І ня важна, калі датычнасьць імпартэраў сокаў да тэракту не пацьвердзіцца. Затое ў падсьвядомасьці гледача замацуецца: прадпрымальнікі і апазыцыя — народ аднолькава небясьпечны.

Праўда, разгортваньню міжнародных назіральнікаў у буфэрнай зоне тэракт не перашкодзіў.

### Сага пра «Садочак»

Выбух у Цхінвалі прымусіў успомніць пра іншы выбух, які адбыўся ў Менску ўначы на 4 ліпеня. Наступствы таго выбуху былі, на шчасьце, куды менш трагічнымі. Але дзеяньні ўладаў, дакладней — альгарытм гэтых дзеяньняў ёсьць сэнс параўнаць.

Спачатку на падставе падазрэньняў у датычнасьці да тэракту затрымліваюць некалькі апазыцыянэраў, у асноўным — былых. Потым іх выпускаюць і недзе праз месяц арыштоўваюць 11 супрацоўнікаў кампаніі «Уладпрадімпарт», якая займаецца імпартам сокаў — у тым ліку, маркі «Садочак». У пачку з-пад таматнага соку гэтай маркі, як усе памятаюць, была схаваная выбуховая прылада з гайкамі. Пазьней высьветлілася, што прадпрымальнікі затрыманыя ў сувязі з фінансавымі парушэньнямі, а не паводле абвінавачаньня ў тэракце.

Але вось зусім сьвежае паведамленьне. Былы супрацоўнік «Уладпрадімпарту», нехта Корык, 30 верасьня затрыманы для допыту менскай міліцыяй. (Гэты факт міліцыя не адмаўляе.) Паводле аднаго зь сяброў Корыка, той быццам бы прызнаўся ў тым, што каля гіпэрмаркету «Гіпа» нейкія невядомыя людзі параілі яму напярэдадні тэракту «зьяжджаць з гораду, паколькі будуць узрываць Менск».

Цікава, ці разглядае сьледзтва ў якасьці магчымага матыву тэракту гандлёвую вайну? Ці ня вырашыў нехта з канкурэнтаў «Уладпрадімпарту» ў барацьбе за рынак збыту таматнага соку ў Беларусі дыскрэдытаваць брэнд «Садочак» і заадно адправіць усё кіраўніцтва кампаніі за краты? А калі ўлічыць сусьветны харчовы і фінансавы крызісы, якія нарадзіліся, як вядома, за акіянам… Вось вам і сьлед, што вядзе на Захад, у высокія кабінэты ЦРУ, Уол-Стрыту і іх філіялаў — АБСЭ, Рады Эўропы ды іншых.

Абсурд? Трызьненьне? Магчыма. Але ў кожным вар'яцтве, як вядома, ёсьць свая сыстэма. У выпадку з выбухам у Цхінвалі расейскай прэсе важна было падтрымаць вобраз Грузіі як падступнага і жорсткага ворага, а значыць — неабходнасьці прысутнасьці расейскіх войскаў у рэгіёне.

А ў выпадку з выбухам у Менску? Апазыцыянэры, інтэлігенцыя, прадпрымальнікі… Ці ня з гэтых катэгорыяў лепшага вобраз ворага ў дзяржаўнай прэсе? І ня важна, калі датычнасьць імпарцёраў сокаў да тэракту ніякім чынам не пацьвердзіцца. Затое ў падсьвядомасьці чытача ці гледача замацуецца: прадпрымальнікі і апазыцыя — народ аднолькава небясьпечны.

Ёсьць, вядома, яшчэ адна прычына, зь якой канфлікт на Каўказе павінен быў бы цікавіць жыхароў Беларусі. Прызнаньне незалежнасьці Паўднёвай Асэтыі новаабранай палатай прадстаўнікоў, якога нецярпліва чакаюць у Крамлі, наўрад ці прынясе мір і спакой у гэты рэгіён і наўрад ці зьменшыць напружанасьць у міжнародных стасунках у цэлым. Пра выбухі там мы пачуем, можна не сумнявацца, яшчэ не аднойчы. А вось ці стаў выбух на праспэкце Пераможцаў апошнім тэрактам у Беларусі? Гэтага мы пакуль ня ведаем.

# Казус Абрамавай

альбо Пусты гранатамёт Кучынскага. Піша **Віталь Цыганкоў.**

Гэтыя выбары даказалі відавочнае — Абрамаву, як і іншых дэпутатаў, «прызначалі». А цяпер не прызначылі.

Ведаеце, што больш за ўсё даказвае «намаляванасьць» і апрэткавасьць вынікаў гэтых выбараў? Не, не параза ў сваіх акругах яркіх апазыцыйных фігураў. Аб'ектыўна кажучы, мы ня ведаем, якая рэальная папулярнасьць гэтых асобаў сярод выбарнікаў — экзыт-полаў не было, сацыялягічных апытаньняў таксама не праводзілася, у дэпутаты яны не абіраліся даўно, мы ня ведаем, наколькі яны вядомыя людзям.

### «Улады не палічылі патрэбным выставіць вядомага чалавека»

Болып за ўсё пра характар гэтых выбараў гаворыць неабраньне Вольгі Абрамавай і Віктара Кучынскага. Віктар Кучынскі ў беларускі парлямэнт (раней Вярхоўны Савет, цяпер палата прадстаўнікоў) абіраецца нязьменна ад 1990 году, і ўвесь час па адной, Кобрынскай акрузе. Вольга Абрамава першы раз перамагла ў сваёй акрузе на ўсходзе Менску ў 1995 г., яшчэ на дэмакратычных выбарах.

28 верасьня 2008 г. Абрамава «набрала» 24% галасоў. Улады нават не палічылі патрэбным выставіць у яе акрузе нейкага вядомага чалавека (артыста, доктара) альбо мясцовага вэртыкальніка, каб потым можна было казаць, што гэты чалавек настолькі важны і вядомы сярод выбарнікаў, што тыя прагаласавалі менавіта за яго. Улады выставілі раней не заўважанага ў палітычным жыцьці і грамадзкай актыўнасьці 62-гадовага фізыка, галоўнага вучонага сакратара НАН Мікалая Казака. Віктар Кучынскі, які калісьці сказаў легендарную фразу, што гатовы абараняць прэзыдэнта нават з гранатамётам, у сваёй акрузе таксама заняў другое месца — яго «перамог» генэральны дырэктар ЗАТ «Аптымалсэрвіс» Аляксандар Зазуля.

### «Нашы героі ня трапілі ў «сьпісы»

Што здарылася? Чаму выбарнікі раптам адвярнуліся ад сваіх дэпутатаў, якія больш як дзесяць гадоў працуюць у акрузе, вырашаючы іхныя канкрэтныя праблемы (Абрамава і Кучынскі, нарэшце, адны зь нямногіх, хто выступаў супраць адмены льгот)?

Можа, Аляксандар Лукашэнка недзе публічна выступіў супраць гэтых кандыдатаў? Альбо мясцовыя ўлады разгарнулі шалёную прапагандысцкую кампанію супраць Абрамавай і Кучынскага, заклеймаваўшы іх як ворагаў стабільнасьці ці прэзыдэнта? Не, нічога такога не было. Проста нашы героі ня трапілі ў «сьпісы».

Калі Вольга Абрамава выйгравала выбары ў 2000-м і 2004-м годзе, больш за ўсё мяне ўражвала (і, прызнаюся, раздражняла) яе нахабная (ці наіўная) упэўненасьць, што на выбарах яна перамагае дзякуючы выключна сваім палітычным здольнасьцям і руплівай працы з насельніцтвам сваёй акругі. «Вось апазыцыя ня ўмее працаваць з выбарнікамі, — гаварыла Абрамава, — яна з сваёй мовай і дэмакратыяй не разумее іхных патрэбаў, а я з сваім змаганьнем за камунальныя паслугі ведаю, што трэба людзям».

Чытаючы гэта, мне хацелася задаць пытаньне: «Вольга Міхайлаўна, няўжо вы не разумееце, што перамагаеце толькі таму, што ўлада вам гэта дазваляе?» І другое: «Як вы думаеце, калі ўлада вырашыць не пусьціць вас у парлямэнт, вы выйграеце гэтыя выбары?»

Калі б Вольга Міхайлаўна шчыра казала: «Так, мяне прызначылі, але я стараюся выкарыстаць гэта дзеля дэмакратыі і маіх выбарнікаў», — я б зразумеў, гэта было б сумленна.

Зрэшты, адказу на мае пытаньні не давялося доўга чакаць. З пэўных прычынаў на гэтых выбарах Абрамава, Кучынскі, Гайдукевіч, Красуцкі, Касьцян ды іншыя найболып прыкметныя дэпутаты палаты ня трапілі ў зацьверджаныя сьпісы «прызначаных».

> Вольга Абрамава была пэўная, што на выбарах перамагае дзякуючы сваім палітычным здольнасьцям.




СЯМЁН ПЕЧАНКО

Гайдукевіч адчуў адразу, што шанцаў няма і не вылучаўся, рознымі супярэчлівымі заявамі спрабуючы захаваць твар, Касьцян, Красуцкі ды іншыя зьняліся ўжо пасьля рэгістрацыі кандыдатамі (ці дачакаліся прапановаў нейкіх пасадаў, ці ім проста даходліва «растлумачылі»). І толькі Абрамава і Кучынскі пайшлі на выбары, спадзеючыся на сваю папулярнасьць сярод жыхароў акругі. Ці гэта наіўнасьць, ці крок адчаю — ня мне меркаваць.

### «Ня выбарнікі тут вырашаюць, і ня варта прыкідвацца незалежнай»

Большасьці дэпутатаў палаты ўсё выключна зразумела — ім «аказваюць давер», іх прызначаюць, яны ў адказ служаць. Вольга Абрамава як інтэлігентны чалавек ніяк не хацела зьмірыцца з такой фармулёўкай — празаічнай і непрывабнай для яе, такой яркай і здольнай палітычнай фігуры.

Але цяпер рэальнасьць зазірнула ў вочы прадстаўніцы «канструктыўнай апазыцыі» — палітычная вага, самастойнасьць і клопат пра выбарнікаў ня маюць ніякага значэньня, больш за тое, гэта падазроныя якасьці. Абрамаву, як і ўсіх іншых дэпутатаў, «прызначалі» і ў 2000-м, і ў 2004-м. А цяпер не «прызначылі».

Можа, Абрамава рэальна набрала 28 верасьня і 80% — я цалкам такое дапускаю, але ня выбарнікі тут вырашаюць, і ня варта прыкідвацца незалежнай.

Тут такая вядомая псыхалягічная абэрацыя. Калі мы недзе перамагаем, нам здаецца, што гэта выключна дзякуючы нашым здольнасьцям, талентам і намаганьням. Калі прайграем, то — вінаватыя надвор'е, абставіны, варожыя прошукі і гэтак далей. Так і Абрамава, напэўна, прымушала сябе верыць, што яна перамагала дзякуючы сваёй клапатлівай працы па «вяртаньні пэнсіянэрам ільготнага праезду ў дачны пэрыяд». Не, Вольга Міхайлаўна, вас прызначалі, а вы за гэта павінны былі казаць «дзякуй». А вы, няўдзячная, галасавалі супраць адмены льготаў. Зрэшты, калі я бачу, як асьцярожна вы даяце інтэрвію пасьля выбараў, калі я чытаю, як вы заклікаеце вашых выбарнікаў не аспрэчваць вынікаў галасаваньня па вашай акрузе, заклікаеце іх спыніць іхны «стыхійны бунт», — я разумею, што для вас ня ўсё страчана. Магчыма, улада яшчэ ацэніць вашу «стрыманасьць».

**Радыё «Свабода»**

# Мы і яны

Толькі калі кінем абстрактныя развагі наконт удзелу ці няўдзелу ў выбарах, Беларусь пачне зьмяняцца. Піша **Андрэй Павач.**

Як жахліва абышоўся прэзыдэнт Качыньскі з Валэнсам, не запрасіўшы яго на ўрачыстасьці, прысьвечаныя 30-й гадавіне ўзьнікненьня свабодных прафсаюзаў; ці ператварылася ўжо Эўропа ў калёнію Расеі, ці гэта адбудзецца налета; ці прапаноўваў міністар Сікорскі выкарыстоўваць у Аўганістане забароненыя касэтныя бомбы — ад тэмаў штодзённай палітыкі, якія безь перапынку абмяркоўваюць камэнтатары на польскім радыё, тэлебачаньні і ў газэтах, у прызвычаенага да «ўсеагульнага дабрабыту і супакою» беларуса хутка пачынае балець галава. Праз некалькі дзён, калі прывыкаеш да бесьперапыннага мільганьня назваў палітычных партый і блёкаў, разнастайных аналітычных арганізацый і каляпалітычных суполак, пачынаеш задумвацца: «Ці ж гэта і ёсьць тая славутая дэмакратыя, якой мы сабе хочам?» Ад гэтай думкі становіцца сьмешна, бо абсалютна ясна, што любы з маіх старэйшых суседзяў ці знаёмых адразу скажа: «Не, лепш Лукашэнка зь Ярмошынай на пару, чым слухаць штодзень па радыё, як «мочацца» якія-небудзь мясцовыя Туск з Качыньскім». Але менавіта тады выхопліваеш з польскай рэчаіснасьці факты, здаецца, на першы погляд, куды менш значнай «палітычнай вагі», аднак якія насамрэч і складаюць сапраўдны істотны зьмест рэальнага функцыянаваньня самакіраванага грамадзтва.

У апошні дзень школьных канікул дырэктарцы адной невялікай местачковай школы паведамілі, што школа зачыняецца, а дзеці пераводзяцца ў суседнюю, да якой будуць дабірацца цэлую гадзіну. Школьнікі і іх бацькі абурыліся і запатрабавалі, каб настаўнікі пачалі навучальны год. Тыя, аднак, пад пагрозай звальненьня, вымушаныя былі адмовіцца. І тады кінутых школьнікаў пачалі вучыць… мясцовыя настаўнікі-пэнсіянэры. Без падручнікаў сямідзесяцігадовыя старыя вучаць малых польскай мове, матэматыцы і гісторыі і амаль аднязначна выйграюць. Школа ў мястэчку будзе існаваць далей.

Хітры журналіст патэлефанаваў у адзін з ваяводзкіх гарадоў вельмі высокапастаўленаму чыноўніку і, прадставіўшыся адказным супрацоўнікам Міністэрства сельскай гаспадаркі, папрасіў уладкаваць на працу свайго сябра. Той адказаў: «Няма праблем» і ўжо на наступны дзень застаўся бяз працы, бо ягонае выказваньне надрукавалі ўсе польскія газэты.

Навіна аб тым, што ў многіх польскіх школах фактычна існуе сэгрэгацыя па маёмасным прынцыпе, калі ў адны клясы адпраўляюць дзяцей заможных бацькоў, а ў другія бедных, наагул узарвала польскую прэсу. У цэлым увага да пытаньняў дзіцяці і школьнага навучаньня тут адразу кідаецца ў вочы. Пасьля бурлівага абмеркаваньня было вырашана выдаткаваць для школьнай адукацыі дадатковыя сродкі і ўжо ў 2010 г. кожны польскі школьнік атрымае ноўтбук для выкарыстаньня ў навучальным працэсе.

Што думаў, калі слухаў гэтыя навіны. Канечне, не аб марных спробах паказаць Беларусь як аазіс спакою пасярод мора «дэмакратычнага хаосу». Думалася аб тых мужных людзях, не палітыках і не афіцыйных лідэрах беларускай апазыцыі, а звычайных грамадзянах (прадпрымальніках, студэнтах, інвалідах, настаўніках і ўсіх іншых), якія, часта ахвяруючы ўласным дабрабытам, спрабуюць расказаць людзям праўду аб становішчы ў краіне і тым самым закладаюць падмурак грамадзтва, якое не на выбарах, а ў штодзённым адстойваньні сваіх правоў дакажа дзяржаве, што «не народ для ўраду, а ўрад для народу». Бо менавіта такі штодзённы выбар простага паляка ў абароне сваіх правоў, а ня сваркі польскіх палітыкаў і ёсьць галоўным вынікам эпохі «Салідарнасьці».

А яшчэ ўспамінаў заплаканы твар маці аднаго забітага ў беларускім войску салдата, якая гэтым летам нейкім цудам трапіла на беларускае ток-шоў «Выбар» (эх, і атрымаў пасьля за яе Хрусталёў ад Зімоўскага). Жанчына крычала, што даведаецца праўду аб тым, хто забіў яе сына, дойдзе да прэзыдэнта… Мабыць, шукае яе дасюль. А мне дасюль сорамна перад ёй, сорамна і за сябе і за ўсіх нашых апазыцыянэраў (дэмакратаў, свабодных журналістаў, праваабаронцаў), што не знайшлі яе, не дапамаглі. Ня дзеля палітычных балаў, а дзеля прынцыпу, што менавіта так трэба. Дзеля таго, што глыбока перакананы: толькі калі кінем абстрактныя развагі наконт удзелу ці няўдзелу ў выбарах, калі перастанем вымяраць сваю грамадзкую актыўнасьць «Днём Волі» ці «Чарнобыльскім шляхам», а калі дапаможам звычайным людзям, не апазыцыянэрам, нават калі не дапаможам, а проста прагнем да іх руку, пакажам, што яны не адны ў змаганьні зь дзяржаўным левіяфанам за правы спакойна займацца прадпрымальніцтвам, жыць у сваім доме ці вучыцца ў нармальнай школе, — перамога будзе пэўнай. Мабыць, ня хуткай, але пэўнай, гэта дакладна.



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

# Чым займаюцца асуджаныя маладафронтаўцы?

На працягу двух гадоў у дачыненьні да сяброў незарэгістраванай моладзевай арганізацыі было распачата больш за два дзясяткі крымінальных справаў. У выніку татальнага ўціску з боку спэцслужбаў 9 маладафронтаўцаў былі асуджаныя па сумнавядомым артыкуле Крымінальнага кодэксу 193 за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, а Зьміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч адбывалі тэрміны ў калёніях.

Чым цяпер займаюцца тыя маладафронтаўцы? Што робяць тыя, хто стаў чалавекам году-2007 у годзе 2008?

**Барыс Гарэцкі** цяпер займаецца журналістыкай і працуе таксоўшчыкам. Разам зь **Віктарам Янчурэвічам** ён мае намер быць адным з кіраўнікоў блёку «Маладая Беларусь» на выбарах у мясцовыя саветы.

**Зьміцер Хведарук** сёлета паступіў у хрысьціянскі каледж, прадэманстраваўшы выдатнае веданьне Бібліі і пасьпяхова здаўшы экзамэны. Напрыканцы лета, пасьля даволі вялікага перапынку, вярнуўся да актыўнай дзейнасьці ў межах арганізацыі. Ён мае шанцы стаць намесьнікам старшыні.

**Наста Палажанка** пасьля сканчэньня школы працягне адукацыю ў ЭГУ на завочным аддзяленьні па спэцыяльнасьці «паліталёгія». Праўда, першую ўстановачную сэсію з дазволу рэктарату дзяўчына прапусьціла, бо тэрмін правядзеньня супаў з завяршальнай стадыяй выбарчай кампаніі — з 26 па 30 верасьня.

**Зьміцер Дашкевіч** спрабуе рэфармаваць «Малады фронт», каб мець жыцьцяздольную арганізацыю напярэдадні прэзыдэнцкай кампаніі. Нядаўна распачалася кампанія дыскрэдытацыі лідэраў арганізацыі і стварэньне ўражаньня расколу ці развалу МФ. Зьміцер стаў першай і асноўнай мэтай правакацыі КДБ, аднак тое ніяк не паўплывала на прагу актыўнай дзейнасьці. «Трэба абтрэсьці пыл і рушыць далей», — кажа Зьміцер.

**Аляксей Янушэўскі**, як і абяцаў, вярнуўся з Чэхіі, дзе падчас крымінальнага перасьледу атрымаў палітычны прытулак. Цяпер узначальвае адукацыйны аддзел арганізацыі, займаецца вэб-дызайнам, чым і зарабляе на жыцьцё. Праз паўтара году скончыць Віленскі пэдагагічны ўнівэрсытэт.

**Іван Шыла** пасьля выключэньня з школы выявіў жаданьне застацца ў Беларусі і працягнуць навучаньне завочна. Нягледзячы на безьліч прапановаў ад эўрапейскіх адукацыйных установаў, ніводная зь іх не прадугледжвала прымальны для хлапца варыянт. Цяпер Іван шукае працу і чакае траўня наступнага году, каб даздаць экзамэн. Як маладафронтавец, каардынуе дабрачынную кампанію «Беларускую кнігу — дзецям».

**Яраслаў Грышчэня** ў верасьні зьехаў у Польшчу на навучаньне па праграме Кастуся Каліноўскага. Жыве ў Гнезьне і атрымлівае спэцыяльнасьць журналіста, займаецца музыкай.

**Наста Азарка** працуе на льнозаводзе і па-ранейшаму бярэ актыўны ўдзел у грамадзкай дзейнасьці. Упартасьць дзяўчыны выклікае зайздрасьць, а вершы — захапленьне.

**Алег Корбан** — рэдактар менскай газэты «Партызанская», сябар АГП і незалежнага прафсаюзу, якім і прысьвячае амаль увесь вольны час. Адышоў ад дзейнасьці «Маладога фронту».

Варта нагадаць пра маладафронтаўцаў, якія былі асуджаныя па «справе 14-ці».

**Уладзімер Сяргееў** працуе на трактарным заводзе. **Арцём Дубскі** жыве ў Асіповічах. Дарэчы, у дачыненьні да хлапца спрабавалі ўвесну завесьці яшчэ адну крымінальную справу за махлярства. Тады маладзёна арыштавалі на трое сутак і бесьпасьпяхова вінавацілі ў тым, што ён падмануў тэлефоннага апэратара на некалькі мільёнаў рублёў.

А **Артур Фінькевіч** займаецца стварэньнем новай моладзевай арганізацыі «Моладзь за Беларусь», якая ўпершыню заявіла пра сваё існаваньне падчас акцыі 28 верасьня, запомніўшыся ўсталяваньнем намётаў і памаранчавага колеру сьцягамі і стужкамі.

**Яўген Красноў**

# Як беларусізаваць беларусаў?

Яшчэ ня сьціхла рэха папсовых канцэртаў «Мы беларусы», як незалежныя арганізацыі пачалі ініцыятыву пад лёзунгам «Будзьма!» Арганізатары расшыфроўваюць яго як заклік да грамадзянаў: «Будзьма беларусамі!»

Прэзэнтацыя кампаніі адбылася 1 кастрычніка ў менскай кавярні «Добрыя мысьлі». Арганізатары — альянс недзяржаўных арганізацыяў, якія дзейнічаюць у сфэры культуры: ад Згуртаваньня беларусаў сьвету да Таварыства беларускай мовы, ад Саюзу беларускіх пісьменьнікаў да часопісу pARTisan.

Задума кампаніі — аб'яднаць беларусаў на падставе не палітычных ці эканамічных інтарэсаў, якія ў кожнага свае, а на грунце культурных каштоўнасьцяў, супольных ды нязьменных для ўсёй нацыі. У рамках кампаніі будуць ладзіць імпрэзы па ўсёй краіне, распаўсюджваць культурную прадукцыю ды рабіць прамоцыю беларушчыне з дапамогай постэраў, паштовак, цішотак ды іншых рэчаў, якія людзі з ахвотай будуць прымаць у падарунак. Кажучы іначай, «Будзьма!» мусіць пасеяць у краіне моду на беларускасьць.

Сэрца кампаніі — сайт budzma.org, які, паводле задумы стваральнікаў, мае зрабіцца блогам, на якім кожны карыстальнік можа пакідаць допісы ды знаходзіць інфармацыю пра кампанію.

Ці здолее «Будзьма!» скласьці канкурэнцыю дзяржаўным прапагандысцкім праектам?

Сама задача кампаніі — пераканаць беларусаў у тым, што стабільнасьць ды парадак нясмачныя бяз роднай мовы ды культуры — падаецца неймаверна цяжкай.

Каб зацікавіць людзей, большасьць якіх разрываецца між некалькімі працамі, дзецьмі ды тэлевізарам зь яго прапагандай ды спажывецкімі тэлешоў, важна прапанаваць ім сапраўды якасны, цікавы ды новы культурніцкі прадукт. Падарыць нешта такое, што дасьць ім адпачынак ад шэрай будзённасьці, даць такія здабыткі культуры, якімі можна ганарыцца. Ажно вось на прэс-канфэрэнцыі «Будзьма!» прагучала прапанова забаўляць людзей… адкрытымі лекцыямі па гісторыі ды культуры. Ці пойдуць туды неабазнаныя ў беларушчыне людзі?

Найгоршым варыянтам будзе, калі «Будзьма!» застанецца акцыяй для прасунутай беларускамоўнай інтэрнэт-аўдыторыі, ня здолеўшы дагрукацца да тых, хто жыве ў сьвеце БТ ды канцэртаў Саладухі.

«Будзьма!» мусіць пасеяць у краіне моду на беларускасьць.

Выглядае, што самі арганізатары кампаніі ўсьведамляюць такую небясьпеку. Гэтак, неўзабаве праз адну зь фірмаў, якая займаецца наўпроставай рэклямнай рассылкай, на больш чым 100 тысячаў паштовых адрасоў па ўсёй краіне будуць разасланыя паштоўкі з заклікам «Будзьма беларусамі!» ды кантактнай інфармацыяй кампаніі. Арганізатары працуюць над стварэньнем аўдыё- і відэаролікаў, якія будуць рэклямаваць беларускасьць, і паспрабуюць прасоўваць іх ня толькі на Белсаце ці ў інтэрнэце, але і на дзяржаўных тэлеканалах ды радыё. Абвесткі пра імпрэзы ў рамках кампаніі будуць актыўна падавацца ў рэгіянальную прэсу. Акрамя гэтага, ужо цяпер школьнікі могуць «абмяняць» свае «дзясяткі» па белмове на падарункі ад кампаніі «Будзьма!»



Ініцыятаркі кампаніі Алена Макоўская (зьлева) і яе паплечніцы.

Падобная кампанія ня будзе мець посьпеху без падтрымкі ўсіх тых, хто зацікаўлены ў прамоцыі беларускасьці.

Вось, скажам, сайт budzma.org. Няма нічога прасьцей, чым напісаць туды крытычны допіс кшталту «каму патрэбная вашая кампанія». Але куды больш плёну будзе, калі юзэры будуць выкарыстоўваць сайт ня толькі для дыскусіяў, але і каб даведацца пра чарговую імпрэзу.

Цудоўна, што такая кампанія распачалася. Але яе арганізатарам варта памятаць і пра тое, што, абвясьціўшы кампанію з такімі амбітнымі мэтамі, яны ўзялі на сябе вялікую адказнасьць. Наколькі посьпех кампаніі можа прынесьці карысьці іміджу беларускай культуры, настолькі няўдача можа нашкодзіць.

**Алесь Бондар**

# «Урок беларускае мовы» прызнаны экстрэмісцкім

Адпаведнае рашэньне суду Кастрычніцкага раёну Горадні апублікаванае ў газэце «Звязда» ад 2 кастрычніка.

Паводле рашэньня суду, у гэты сьпіс трапілі фільм «Урок беларускай мовы» Міраслава Дэмбіньскага, а таксама запіс канцэрту «Салідарныя зь Беларусьсю», які праходзіў у Варшаве 12 сакавіка 2006 году.

Гэтыя матэрыялы, а таксама яшчэ сем дыскаў з фатаздымкамі падзеяў на Плошчы, 11 чэрвеня былі сканфіскаваныя ў магілёўскага актывіста Алеся Буракова, які вяртаўся з Варшавы.

Рашэньне суду ўступіла ў сілу 16 верасьня. Сам Буракоў кажа, што не атрымліваў ніякіх позваў у суд, а таксама нічога ня ведаў пра вынесены прысуд.

Варта адзначыць, што ў рок-канцэрце ў Варшаве бралі ўдзел найлепшыя беларускія рокеры, у тым ліку N.R.M. А фільм «Урок беларускай мовы» апавядае пра дзейнасьць Беларускага ліцэю імя Якуба Коласа, зачыненага ўладамі. Фільм атрымаў некалькі прызоў на міжнародных кінафэстывалях і быў паказаны па ТВ у дзясятку эўрапейскіх краінаў. А для лукашэнкаўскага КДБ і суду — экстрэмізм… Бо пра непадкантрольную беларускасьць.

Нагадаем, што яшчэ гарадзенскім КДБ была ініцыяваная адна справа з «экстрэмізмам». 18 верасьня мусіў пачацца разгляд справы па прызнаньні экстрэмісцкай друкаванай прадукцыі, што ў розныя гады была сканфіскаваная гарадзенскімі памежнікамі.

Па справе праходзіць дзевяць чалавек (цяпер можа высьветліцца, што іх нашмат болей) — журналіст Анджэй Пісальнік, сябар АГП Уладзімер Ларын, сёньняшнія і былыя студэнты праграмы Каліноўскага Яўген Скрабутан, Аляксей Трубкін, Дзьмітры Мальчык, Барыс Гарэцкі, праваабаронца Валеры Шчукін, Юры Марціновіч і Дзьмітры Ёдка.

Сярод магчымых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў разглядаюцца газэта непрызнанага Саюзу палякаў «Głos znad Niemna na uchodźstwie», кніга Паўла Севярынца «Лісты зь лесу», матэрыялы першага Кангрэсу дэмакратычных сілаў, улётка Аляксандра Мілінкевіча.

Працэс быў перанесены на кастрычнік. Наколькі вядома, пакуль ніхто зь фігурантаў не атрымліваў паўторныя позвы зьявіцца ў суд.

**Зьміцер Панкавец**

# Палітычны пасьянс

Найхутчэй, што наступныя прэзыдэнцкія выбары пройдуць пры канцы 2010 году ці на самым пачатку 2011 году. Такім чынам, да іх застаецца два гады. Апазыцыі пара вызначыцца, як яна мае ўдзельнічаць у гэтых выбарах і як і каго вылучаць. Сьпіс магчымых прэтэндэнтаў досыць шырокі, але, як паказвае практыка кампаній—1994, 2001 і 2006, колькасьць актывістаў дэмакратычнага руху ў краіне такая, што подпісы здольныя сабраць ня больш за два незалежныя кандыдаты. **Зьміцер Панкавец** прапануе кароткі аналіз шанцаў і пэрспэктываў магчымых прэтэндэнтаў.

Пры ўсіх «але» **Аляксандар Мілінкевіч** застаецца самым пазнавальным і папулярным лідэрам апазыцыі. Падчас мінулай прэзыдэнцкай кампаніі палітык дабіўся вядомасьці, прычым, што важна, ня толькі ў Менску. На працягу наступных двух гадоў Мілінкевіч ня зьменшыў інтэнсіўнасьці сваіх



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Карняенка мог стаць адзіным кандыдатам яшчэ на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах.**

паездак па рэгіёнах. Ніхто больш з апазыцыйных палітыкаў на падобнае не адважваўся. Ня дзіва, што ў рэгіёнах вельмі многія гатовыя падтрымаць Мілінкевіча зноў. Зь ягонага боку людзі адчуваюць прынамсі ўвагу. Дый, кажуць яны, коней на пераправе не мяняюць.

Увесь пасьлявыбарчы час Мілінкевіч выконваў прэзыдэнцкую працу, сустракаючыся з кіраўнікамі эўрапейскіх краін і ЗША. Разам з тым, ёсьць знакі таго, што менавіта Амэрыка ня хоча бачыць Мілінкевіча кандыдатам на наступных прэзыдэнцкіх выбарах, што выявілася ў шэрагу красамоўных палітычных жэстаў.

Яшчэ варта адзначыць, што



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Міхалевіч мае разгалінаваную геаграфію аднадумцаў, але іх мала, каб сабраць сто тысячаў.**

Мілінкевічаў «Рух «За Свабоду» так і не крышталізаваўся, ня стаў рэальнай палітычнай сілай. Відавочны мінус руху — ён ствараўся для людзей, якія раней ня ўдзельнічалі ў палітыцы, а ягоны касьцяк склалі тыя самыя актывісты Партыі БНФ, незарэгістраванага «Маладога фронту», дзе-нідзе АГП.

Лідэры палітычных партыяў таксама ня схільныя бачыць у пэрсоне Мілінкевіча імавернага кандыдата. Многія пасьпяшаліся сьпісаць яго як палітыка, што, на іх думку, сказаў і зрабіў ужо ўсё, што мог.

За сьпінай Мілінкевіча ўвесь гэты час знаходзіўся **Віктар Карняенка**. Гэта яшчэ адзін выхадзец з рэгіянальнага актыву. Карняенка, а не Мілінкевіч мог стаць адзіным кандыдатам яшчэ на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах, але нешта тады не зраслося.

Надзея паспрабаваць свае сілы празь пяць гадоў у Карняенкі ёсьць. Многія незадаволеныя пэўнай пасіўнасьцю Мілінкевіча вы-



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Саньнікаў выглядаў бы новым чалавекам для шырокага выбарца.**

лучаюць у якасьці альтэрнатыўнай фігуры менавіта ягонага галоўнага памочніка. Пры пэўным раскладзе Карняенку могуць падтрымаць і партыйныя лідэры.

Карняенка славіцца ўменьнем рабіць ценявую работу. У той самы момант мала што можна сказаць пра яго як пра публічнага палітыка. Ня варта скідаць з рахункаў і досыць вялікі нэгатыўны рэйтынг намесьніка лідэра «Руху «За Свабоду» сярод актыву.

Старшыня Партыі БНФ **Лявон Баршчэўскі** многімі ад пачатку разглядаўся як асоба на палітычнай арэне краіны часовая. На справе ж выявілася, што дасьведчаны Баршчэўскі, які хоць і адсутнічаў у палітыцы ад 1999 году, мае немалыя амбіцыі. Бракуе яму толькі сродкаў для іх рэалізацыі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лябедзька даказаў уменьне дамаўляцца і трымаць слова.**

Пакуль Баршчэўскі абмяжоўваецца прамацваньнем глебы ўнутры партыі і вакол яе. Гэта ўсё адбываецца на фоне пастаянных выказваньняў пра неабходнасьць вылучыць на выбары фронтаўскага кандыдата. Ці ёсьць у БНФ нейкія іншыя годныя прэтэндэнты, апроч Баршчэўскага? Навідавоку — не.

Баршчэўскі разумее, што ў фрагмэнтаваным сьвеце палітычных партыяў посьпех (збор 100 тысячаў подпісаў) магчымы толькі пры ўмове выбудовы максымальна шырокай кааліцыі. Менавіта таму ён перамаўляецца, з аднаго боку, з Саньнікавым, а з другога — зь **Зянонам Пазьняком**. Зрэшты, усё ж ня факт, што Баршчэўскі такі адважыцца ісьці.

Нияк не сфармуляваў яшчэ палітычных задачаў сваёй партыі на



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Баршчэўскі хоць і адсутнічаў у палітыцы ад 1999 г., мае немалыя амбіцыі.**

2010 год Пазьняк. Патэнцыял партыі не зьмяніўся ад 2001 і 2006 гадоў, таму ад палітыка патрабуецца зьдзейсьніць нешта нечаканае, каб вынік стаў іншым. Ніхто не сумняецца, што Пазьняк на неспадзяваныя крокі здольны, але ўпарта вычэквае спрыяльнага моманту. Пазьняк захоўвае перавагу свайго бліскучага аратарскага таленту. Ёсьць і вялікае «але»: вось ужо гадоў дзесяць як ён ня мае досьведу выбудоўваньня кааліцыі, а бяз гэтага цяжка зрабіць нешта рэальнае. Дарэчы, сам Народны Фронт канца 1980-х—пачатку 1990-х быў у сваім кшталце такой кааліцыяй.

Крыху аціхлі размовы пра кандыдацтва каардынатара «Хартыі-97» **Андрэя Саньнікава**, мо таму што ён нідзе публічна не заяўляў пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі.

Выпускнік ін'язу Саньнікаў цу-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Калякін фармуе шырокую кааліцыю.**

доўна размаўляе на некалькіх замежных мовах. Яго добра ведаюць на Захадзе. У той жа час ён ня быў «нікім» у Беларусі: займаў пасаду намесьніка міністра замежных справаў. Саньнікаў мог бы выглядаць адносна новым чалавекам у палітычным жыцьці краіны. Для шырокага выбарца, але не для палітычнага сьвецiка. У якім Саньнікаў шмат з кім пасвараны.

Хапае нядобразычліўцаў і ў **Алеся Міхалевіча**, які таксама хіба што падумвае аб прэзыдэнцкіх выбарах. Натуральна, кацiроўкі палітыка рэзка зьменшыліся пасьля паразы ва ўнутрыпартыйных гульнях у БНФ.

Нягледзячы на гэта, Міхалевіч



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Рынкевіч пра прэзыдэнцкія амбіцыі не заяўляў, але такі варыянт ня выключаны.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Статкевіч спадзяецца на актывістаў незарэгістраваных БХД і «Маладога фронту».**

мае досыць разгалінаваную геаграфію сваіх аднадумцаў. Ад Горак да Берасьця, ад Белаазёрску да Гарадка. Хаця, як правіла, гэта невялічкія беларускія гарадкі, кшталту Жыткавічаў ці Смалявічаў. Іх мала, каб сабраць патрэбныя сто тысячаў. Хіба што Мілінкевіч велікадушна і публічна перадасьць «гетманскую булаву».

Мінусы і плюсы Міхалевіча



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Каго падтрымае экс-кандыдат на пасаду прэзыдэнта, былы палітвязень Казулін?**

фактычна цалкам супадаюць зь мінусамі і плюсамі Карняенкі. На баку Міхалевіча ўзрост, мабільнасьць, маладосьць ягонай каманды. На баку Карняенкі — досьвед, веданьне рэгіёнаў і адсутнасьць багажу нядаўняй паразы.

Упэўненыя ў сваім жаданьні выпрабаваць сілы на пераправе чарговай прэзыдэнцкай кампаніі і «старыя коні» — **Анатоль Лябедзька** і **Сяргей Калякін**. Абодва маюць вялікі нэгатыўны рэйтынг, як у грамадзтве, дзякуючы БТ, так і ўнутры апазыцыі — проста праз тое, што трымаюцца на першых ролях у безнадзейных гульнях апазыцыі ўсе дзесяць, а то і пятнаццаць гадоў. Але пры гэтым за абодвума стаяць наймацнейшыя партыі, а самі яны даказалі сваё ўменьне трымаць удар. Таксама яны ўмеюць дамаўляцца і трымаць слова, што першасна для фармаваньня кааліцыі.

Калі Лябедзька аднойчы даказаў гатоўнасьць падпарадкавацца рашэньню Кангрэсу наконт абраньня адзінага, то Калякін, здаецца, на гэты раз гатовы балята-

# — 2010

вацца пры любых умовах. Аднак помніцца, што ў 2001 г. камуністы так і не змаглі назьбіраць за свайго лідэра патрэбныя 100 тысячаў подпісаў. Актыў жа ПКБ за гэтыя гады не памаладзеў. Кандыдаты ад ПКБ на выбарах 2008 г. усе разам узятыя і блізка не сабралі 100 тысячаў подпісаў, як, зрэшты, і кандыдаты ад АГП, ПБНФ і, пагатоў, сацыял-дэмакратаў. Дзе ўзяць дадатковыя люд-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Шумчанку таксама сьпеюць прэзыдэнцкія амбіцыі.**

зкія рэсурсы? Калякін ад самага 2006 г. намагаецца вырашыць гэтае пытаньне. «Товарищ» з газэты ПКБ ператварыўся ў газэту левых сілаў. З камуністамі зблізілася ліквідаваная Партыя працы, і асобныя рэгіянальныя асяродкі без партыйнай прыналежнасьці сталі гатовыя пайсьці за моцным і ўжо звыкла «сваім», хоць і камуністам. А тут і БСДП зрынула Казуліна...



**Пазьняк яшчэ не сфармуляваў палітычных задач сваёй партыі на 2010 год.**

Выкажам меркаваньне, што сіла заявак Калякіна і Лябедзькі ці кандыдата «Руху "За Свабоду"» будзе залежаць ад фактару **Аляксандра Казуліна**, зь якога ня зьнятая судзімасьць (але пры патрэбе яе здымуць, каб павялічыць блытаніну). Каго падтрымае экс-кандыдат на пасаду прэзыдэнта, былы палітвязень? Левага ці правага? Лібэрала ці дзяржаўніка? Кагосьці з даўніх лідэраў ці новую постаць? А чаму не

чалавека выключна блізкага і вернага? Напрыклад, свайго былога адваката і намесьніка **Ігара Рынкевіча**.

Сам Рынкевіч пра ўласныя прэзыдэнцкія амбіцыі не заяўляў нічога і ніколі, але такі варыянт зусім ня выключаны. Высокі, шыракаплечы Рынкевіч мае дзьве вышэйшыя адукацыі, цудоўна гаворыць па-беларуску і па-расейску. Сьмеласьці яму не займаць, толькі не зразумела, ці валодае ён цэласным бачаньнем сытуацыі ў краіне.

У былога палітвязьня **Міколы Статкевіча** праблема яшчэ горшая, чым у Сяргея Калякіна. Жаданьне ёсьць, а вось людзей вобмаль. Энэргія ёсьць, але ёсьць і рахункі налева і направа. Напэўна, спадзяваньні Статкевіча найперш зьвязаны з актывістамі незарэгістраваных БХД і «Маладога фронту». Толькі гэ-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пры ўсіх «але» Мілінкевіч застаецца самым пазнавальным і папулярным.**

тых сілаў таксама зусім ня хопіць, каб адолець патрэбную планку ста тысячаў подпісаў, а каго яшчэ Статкевіч можа заангажаваць без падпоркі кааліцыі — ня бачыцца.

Магчыма, што амбіцыі загудуць і ў кімсьці з прадпрымальнікаў. У прыватнасьці, гаворка можа весьціся пра **Анатоля Шумчанку**.

Гэта, бадай, усе прадстаўнікі апазыцыі, якія хоць нейкім чынам заявілі пра свае жаданьне паўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах. Як бачым, у сьпісе пакуль зусім няма жанчын, дзеячаў з рэгіёнаў, чыноўнікаў (гэтыя заўжды вылазяць зьнянацку, як Казулін ці, раней, Марыніч), а таксама непалітычных прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці — хаця б такіх, як у 2001-м г. Ганчарык, а ў 2005-м — дырэктар Ліцэю Ўладзімер Колас. Ня выключана, што нехта яшчэ можа праявіцца напярэдадні саміх выбараў. Чаканьні і запатрабаваньне на новага палітыка ў грамадстве ёсьць. Зьніадкуль такі ня зьявіцца, бо так не бывае, але кожная неспадзяванка паспрыяе таму, каб сытуацыя перастала выглядаць да сумнага прадказальнай.

# Карт-блянш на чацьверты тэрмін

Пакуль апазыцыя пілуе пілавіньне, кіраўнік дзяржавы ўжо рыхтуецца да новых выбараў. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Апошнія сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі склалі сымбалічную трыяду. Кожны раз афіцыйны лідэр гаварыў тое, што ад яго хацелі пачуць.

У панядзелак ён запэўніў Пуціна, што сяброўствам з Расеяй гандляваць не зьбіраецца. Назаўтра выліў бальзам на душу фіну Стубу, дзейнаму старшыню АБСЭ. Маўляў, мы гатовыя на любыя дачыненьні з Эўропай (во як, ні многа ні мала!). Ну а яго, спадара Стуба, — за тое, што ўглядзеў прагрэс на нашых выбарах, — гатовы бачыць пажыцьцёвым кіраўніком гэтай панэўрапейскай інстытуцыі.

А паміж гэтымі разнавэктарнымі дэклярацыямі была сустрэча зь вярхоўкай КДБ. І там панавала

Надзеі Эўропы раскруціць Менск на паўзучую дэмакратызацыю праз якую-небудзь «дарожную карту» выглядаюць прывіднымі.

думка, што Эўропа Эўропай, дыялёг дыялёгам, а расслабляцца, хлопцы, ні ў якім разе нельга.

І менавіта гэтая тэза гучала найболей шчыра ды пераканаўча.

Прызначыць фіна Стуба пажыцьцёвым кіраўніком АБСЭ — зразумела, з разраду дабрадушнага гумару. А вось для Беларусі сцэнар пажыцьцёвага прэзыдэнцтва цалкам імаверны. Пакуль тытульная апазыцыя ладзіць свае імітацыйныя кампаніі (што байкоту, што ўдзелу), Лукашэнка ўсё падпарадкоўвае звышмэце захаваньня ўлады.

Цяпер у якасьці імавернай пэрсанальнай альтэрнатывы яму называюцца ў асноўным палітыкі, рэйтынг якіх — у межах статыстычнае памылкі. І патэнцыял раскруткі — скажам шчыра — мінімальны, бо за кожным цягнецца ўжо неадчэпны шлейф паразаў ды рэпутацыйных хібаў.

Новую ж фігуру, па-першае, яшчэ пашукаць трэба. Па-другое — а ці захочуць партыі «працаваць па дзядзьку»? Па-трэцяе, а як раскруціць тую альтэрнатыву ва ўмовах амаль што непадзельнай мэдыйнай манаполіі ўлады?

Па-чацьвертае, і гэта самае прыкрае, гаворкі пра стратэгію, пра сутнасны апгрэйд палітычнай альтэрнатывы ў лягеры апазыцыі не чутно.

(Калі я недачуў, падкажэце:)). Здаецца, пакуль што не прыдумана нічога лепшага, як зладзіць інфармацыйную кампанію датычна тлумачэньня несправядлівасьці мінулай электаральнай кампаніі (!). Дэйл Карнэгі называў гэта «пілаваць пілавіньне».

Між тым дзейны кіраўнік дзяржавы ўжо напоўніцу рыхтуецца да наступных выбараў. Таму і абраны варыянт стэрыльнага парлямэнту, нават безь мікрадозы апазыцыйнасьці.

І ня трэба тут аналітыкам надта ламаць галовы: чаму ж было вырашана «кінуць» заходнікаў? Яшчэ не ставала, каб у заканадаўчым органе ўскочыў фурункул кшталту колішняй групы «Рэспубліка»! Плацдарм сыстэмнай крамолы абсалютна недарэчны, калі трэба афармляць чарговую элегантную перамогу. І таму надзеі Эўропы раскруціць Менск на паўзучую дэмакратызацыю праз якую-небудзь «дарожную карту» выглядаюць прывіднымі.

Дарэчы, зьвярнеце ўвагу: Лукашэнка ўжо маральна рыхтуе Захад да свайго чацьвертага тэрміну, акцэнтуючы ўвагу на асаблівасьцях айчынных палітычных традыцый ды згадваючы пра ангельскую каралеву. Гэтаксама ён папярэджваў заходнікаў перад 28 верасьня: новы парлямэнт вам не спадабаецца. Але Эўропа ўсё сакатала пра станоўчыя сыгналы.

Зрэшты, і працягвае сакатаць. Калі Менску пашчасьціць захаваць пэрыяд манэўраваньня між Масквой і Брусэлем, ператварыць тую «дарожную карту» ў беспамерна-гумавы аналяг «братняй інтэграцыі», то цяперашні кіраўнік Беларусі дэ-факта можа атрымаць ад Захаду карт-блянш на чацьверты тэрмін. А калі і не атрымае, то гэта наўрад ці што зьменіць у ягоных плянах.

# Лукашэнка: Падлічваць галасы — гэта прыніжэньне беларускага народу

**Працяг са старонкі 3.**

«Хачу задаць пытаньне «сьвядомай» інтэлігенцыі. Хто меў рацыю: Лукашэнка са сваёй палітыкай абароны эканомікі і арыентацыі на нармальную мадэль разьвіцьця ці тыя дзеячы, якія называюць сябе рыначнікамі?» — сказаў ён. [Ён паранейшаму ўжывае слова «сьвядомыя» па-расейску ў абразьлівым сэнсе.]

«Думаю, на Захадзе хутка апамятаюцца і будуць трымаць свой нацыянальны здабытак у руках дзяржавы, як трымаем гэта мы заўсёды, — вось адказ на галоўнае пытаньне, якое можна адрасаваць і частцы той «сьвядомай» інтэлігенцыі, якая крытыкуе праводжаны Беларусьсю курс», — падкрэсьліў Аляксандар Лукашэнка.

Даючы ацэнку праведзеным парлямэнцкім выбарам, ён адзначыў, што пасьлявыбарная сытуацыя адкрывае новыя магчымасьці для канструктыўнага дыялёгу Беларусі з Захадам. Аднак «нельга самасупакойвацца і цешыць сябе дасягнутым».

«Я хацеў паказаць асобным чыноўнікам, бізнэсмэнам, асобным «сьвядомым» [БЕЛТА тройчы цытуе гэтае слова «сьвядомыя» — цяжка зразумець, чаму аж трайны зварот да сваіх палітычных праціўнікаў, шырэй — людзей зь іншымі поглядамі] грамадзянам, што нашы адносіны з Захадам — гэта не адносіны Лукашэнкі з Захадам. Прычына гэтых адносін не ў Лукашэнку», — сказаў ён.

Падкрэсьліўшы, што выбары праводзіліся «па панянцях ЭС і АБСЭ», кіраўнік дзяржавы сказаў: «Вынік вы бачылі. Што ж, дзякуй заходнікам, што яны сябе так паводзілі».

«Міжнародным назіральнікам былі дадзеныя шырокія магчымасьці для бесьперашкоднай работы, — падкрэсьліў ён. — Аднак іх патрабаваньні дазволіць ім падлічваць галасы — гэта «прыніжэньне беларускага народу». Ёсьць нейкая мяжа», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Пры гэтым зробленыя Беларусьсю захады напярэдадні і цягам парлямэнцкіх выбараў не атрымалі, на жаль, належнай і аб'ектыўнай ацэнкі з боку Захаду. І гэта, бясспрэчна, выклікала расчараваньне ў той, няхай і невялікай, часткі грамадства, якая была прыхільная ідэі найхутчэйшага збліжэньня з Захадам». [Пад грамадзтвам тут маецца на ўвазе, вынікае, чынавенства.]

У час сустрэчы А.Лукашэнка таксама абазначыў практычныя задачы. Гаворка пра «поўную каардынацыю дзеяньняў усіх сілавых структур, выключыць факты дубляваньня функцый або нездаровага суперніцтва. Гэта задача павінна быць у найбліжэйшы час вырашана Дзяржаўным сакратарыятам Рады Бясьпекі».

Ён таксама азнаёміўся зь дзейнасьцю новага падразьдзяленьня — апэратыўна-сытуацыйнага цэнтру КДБ, наведаў гістарычна-дэманстрацыйны цэнтар, дзе пакінуў запіс у Кнізе ганаровых наведвальнікаў.

**Мікола Бугай; цыт. інф. БЕЛТА**



Алёіз (справа) і Фердынанд.

## Алёіз

**А гэты Алёіз цікавы хлопец. Яму ўжо 72 гады, а ён так і застаўся хлопцам, не ажаніўся... Нарадзіўся ён у 1936 годзе, калі заходняя частка Беларусі была яшчэ пад Польшчай, у Варапаеве...** Алёіз застаўся сіратою, перад вайною памерла маці. Яго цётка, якая жыла ў Варшаве, узяла маленькага Алёіза на выхаваньне... Драматычны лёс не дазволіў стварыць сваёй сям'і, даволі аскетычны лад жыцьця адбіўся і на характары Алёіза. Нешматслоўны, дый давялося яму пажыць у розных краях, акрамя роднай, засвойваць і іншыя мовы... Алёіз атрымаў адукацыю архітэктара ў варшаўскай Палітэхніцы. Працаваў у Варшаве, а ў пачатку 1970-х зьехаў у Францыю, дзе ўладкаваўся на працу ў прэстыжную фірму. Пры сваім аскетызьме Алёіз мае дапытлівы характар, што дазваляе яму займацца многімі справамі...

Пазнаёміўся я зь ім выпадкова. Неяк у жніўні патэлефанавала мая сяброўка Лецечка і прасіла дапамагчы з жытлом на месяц у Менску цікаваму чалавеку, Алёізу Судніку, з Парыжу, які мусіў прывезьці ў Беларусь літаратурныя матэрыялы аб жыцьці Эміліі Плятэр... Пры канцы верасьня сустрэў я Алёіза і ўладкаваў яго ў сваёй майстэрні. Мы разгаварыліся ў дарозе на яго радзіму, у Варапаева. За стырном «Таёты» ён апавядаў, як перад самым пачаткам вайны ў Аўганістане зьмушаны быў прабыць у той краіне паўгоду... Ён згубіў пашпарт, і яму даводзілася розным людзям даказваць, што ён не шпіён... Пасьля я даведаўся цікавую гісторыю вандраваньня Алёіза ў Індыю, на поўнач, недзе каля Непалу. У той французскай фірме з Алёізам працавала жанчына, сэрбка зь Югаславіі, у якой дачка зьехала ў Індыю і ўжо болей за год не падавала зьвестак пра сябе. Яна прасіла Алёіза знайсьці гэтае дзяўчо. І ён знайшоў. Кажа, вельмі прыгожая, тусуецца сабе з рознымі крышнаітамі, ды людзьмі з Тыбету, но і наркотыкі ўжывае... Але праз паўгоду вярнулася да маці...

А яшчэ дзе быў ты, Алёіз, пытаюся я? На Шпіцбэргэне, адказвае. Дабіраўся на гэтыя паўночныя выспы невялікім нарвэскім караблём, які вазіў людзей працаваць туды. Гэта было ў жніўні, самы найлепшы час у тых месцах... А што ты там рабіў, чаго так далёка забраўся? А так, цікава, здымкі на слайд рабіў, запісы... Распавядае, што ані дрэўца там няма, толькі мох і белыя дробныя кветачкі. І ўявеце сабе, адзін адпраўляецца пешшу ў вандроўку працягласьцю 300 кілямэтраў, 150 у адзін бок і 150 зваротна, дзе ані чалавека, ані дрэўца. Толькі аднойчы ён напаткаў нейкае маленькае збудаваньне, дзе былі пакінуты запалкі, соль і блякнот з алоўкам. Кажа, гэта, відаць, для паляўнічых на белых мядзьведзяў, а іх у гэты час ужо не было там, яны рухаюцца вышэй, на поўнач, куды перабіраюцца цюлені... З сабою Алёіз меў маленькі намёт, тры балёнчыкі вадкага газу ды трохі ежы. Ваду браў з рэчак, у гэты час яны напаўняюцца з талых верхавінаў гор. Вада вельмі чыстая, прыдатная для піцьця. А раней, у чэрвені ці ліпені, дзьмуць моцныя вятры так, што ўсё перасыхае... Пару разоў бачыў над сабой гелікоптэры, ад дапамогі якіх адмовіўся. Ужо вяртаючыся, страціў шмат сілаў: пульс, кажа, быў 45 удараў на хвіліну... Уся вандроўка заняла 21 дзень. У порце сустрэў тых нарвэскіх маракоў, што везьлі яго на Шпіцбэргэн. Яны расказалі, што адзін зь іх сяброў загінуў на беразе: выйшаў, а белы мядзьведзь проста паклаў яму лапу на галаву. Яны ўсё бачылі з карабля, а дапамагчы нічым не змаглі...

Мы едзем да «пляменьніка» Алёіза, Фэрдынанда Сініцы. Жывуць Фэрдынанд ды Ванда на ўскрайку Варапаева у лесе, дзе даволі нізкае месца, нават забалочанае, а чарот вышэйшы за чалавека... У дварышчы на жэрдцы падвешаны каршун, які нішчыў курэй у Сініцы... Хата Фэрдынанда драўляная, абкладзеная белаю цэглай, высачэзная... Кажу Фэрдынанду, што людзі з такімі шляхетнымі імёнамі павінны жыць у такіх вялікіх дамах. Разьвітваемся, Алёіз застаецца гасьцяваць на пару дзён, а мы з Валенсіяй крочым у свае Вайшкуны, што тутака недалёка.

**Алесь Шатэрнік**
**2 кастрычніка 2008**
**Вайшкуны**

## Драздовіч ва ўспамінах Сергіевіча

Язэп Драздовіч пакінуў па сабе адны загадкі. Невядома нават, дзе ён сустрэў сьмерць і пахаваны. Пайшоў сабе і пайшоў мастак. На 120-годзьдзе Драздовіча, што будзе 13 кастрычніка, прыдаліся ўспаміны пра яго, запісаныя колісь ад Пётры Сергіевіча — яшчэ аднаго патрыярха нашага мастацтва.

Між іншага, думку напісаць вядомую карціну «А хто там ідзе?» паводле Купалавага вершу, Сергіевічу падаў Язэп Драздовіч. Яны часта сустракаліся ў 1920—30-я. Жылі ж у адным горадзе, у Вільні, і турботы ў іх былі аднолькавыя.

У тыя часы Драздовіч выхадзіў усю Заходнюю Беларусь. З мальбэртам праз плячо, з кайстрай пэндзляў пры баку, абветранага і загарэлага, але прагнага жыцьця і пазнаньня, летуценнага, яго можна было ўбачыць на Ашмяншчыне і Навагрудчыне, Міршчыне і Вілейшчыне, маляўнічыя куточкі якіх самі клаліся на палотны і лісты Драздовіча. Гэтак нарадзілася серыя альбомаў з пэйзажнымі і партрэтнымі замалёўкамі: «Краявід зь елкаю» (у крузе), «Краявід з сасною», «Дуб ля хутара», «Пінскае балота», «Зімовы краявід з каплічкаю».

З трапяткім хваляваньнем Драздовіч расстаўляў мальбэрт і перад сівымі мурамі нашай даўніны — касьцёламі, замкамі, каплічкамі, гарадзкімі брамамі. Маляваў іх Драздовіч таропка, парывіста, нібы баяўся, што рассыплюцца ў пясок. У творах старога дойлідства яму бачыліся моц продкаў, іх дух непакоры перад ворагамі і стыхіяй. Крэва, Ліда, Навагрудак, Мір, Трокі, Меднікі знайшла адбітак на графічных лістах Драздовіча.

У 1929 годзе сэрца яго паклікала прайсьціся па сьцежках Францішка Багушэвіча. І як вынік зьявілася каля дзвацаці яго замалёвак, зьвязаных з памяцьцю пра Багушэвіча. Зь іх выявлена толькі некалькі, і то рэпрадукцыі. Гэта малюнак сядзібы Багушэвіча, капліцкі пры сядзібе, камень-валун з надпісамі: «Памяці Мацея Бурачка». І сямейнай магілы Багушэвічаў у Жупранах. А дзе ж рэшта? Іх трэба шукаць! Былі яны ўкладзеныя ў два сшыткі.

Драздовіча цікавіла ня толькі выяўленчае мастацтва. Ён і слова шанаваў. Нават складаў слоўнік народнай мовы. Сергіевіч, характарызуючы Драздовіча як асобу, неяк сказаў: «Быў ён чалавек цэласнай натуры. У голасе яго заўсёды чулася і песьня, і роздум, і пагаворка».

**Уладзімер Содаль**

## Казакі без нагаек

**У Слуцку праходзіў казацкі круг гарадзкога аддзелу Ўсебеларускага аб'яднаньня казацтва.** Слуцкія казакі падводзілі вынікі дзейнасьці за год. Галоўнымі клопатамі былі пытаньні адраджэньня казацтва, выхаваньне моладзі і адлучэньне яе ад нэгатыўных уплываў вуліцы. Усе, вядома, размаўлялі па-расейску. Нечаканым для невялікага гурту мясцовых казакоў была прысутнасьць прадстаўніка райвыканкаму, сьвятара, іншых акруговых атаманаў.

Але што адраджаць, калі на Случчыне ні пры адным з уладарыўшых тут у XIV—XVIII стст. князёў не было ў войску казакоў. Ад татараўкрымчакоў, запаросцаў, маскоўскіх заваёўнікаў горад баранілі «выбранцы» — жыхары блізкіх ад Слуцку вялікіх вёсак Лучнікі, Бранавічы і Варкавічы.

Казакі ж зьявіліся за расейскім часам. Калі ў вёсках у 1905—1907 гады ўсчыналіся сялянскія бунты, улады накіроўвалі туды для ўціхамірваньня казакоў з нагайкамі. У памяць аб іх знаходжаньні тут адна зь вялікіх вуліц Слуцку называлася Казацкай. Бальшавікі перайначылі яе ў Чырвонаармейскую, яна такой застаецца і сёньня.

**Міхась Кутнявецкі,**
**Слуцак**

## Дзень гораду ў Докшыцах

**Першы дзень сьвята, калі ў Докшыцах адчынілі новую аўтастанцыю ды канцэртную залю, а ў суседнім Парфенаве старшыня аблвыканкаму Андрэйчанка запаліў газ, трымалася дажджлівае надвор'е.**

Да дня горада нарэшце адчынілі канцэртную залю, абсталяваную ў будынку былога кінатэатра «Іскра». А таксама дабудавалі жылы дом, адрамантавалі дарогі і тратуары на некаторых вуліцах.

Але, нягледзячы на вонкавыя зьмены, у сьвядомасьці людзей мала што зьмянілася: жлукцяць моладзь гарэлку і піва. Вось і адкрыцьцё новай дыскатэчнай залі ў тым жа былым кінатэатры п'яная моладзь «адзначыла» бойкай, у якой, па чутках, удзельнічалі 16 чалавек. У ход ішлі нават палкі, і тое прымусіла ўмяшацца міліцыянтаў, якія затрымалі некалькі чалавек.

У гэтыя дні ў Докшыцах зьявілася некалькі надпісаў «Жыве Беларусь!», адзін зь якіх быў зроблены чорнай фарбай на дзьвярох школы. А падчас самых сьвяткаваньняў на даху аднаго з прыватных дамоў горада залунаў бел-чырвона-белы сьцяг. Афіцыйны чырвона-зялёны прысутнічаў на прымеркаваных да Дня горада спартыўных спаборніцтвах, павешаны дагары нагамі юнымі бээрэсэмаўцамі. Іх «традыцыю» прадоўжылі падчас парлямэнцкіх выбараў у суседнім аграгарадку Таргуны, дзе сьцяг таксама вісеў зялёнай паласой уверх.

І ўсё ж уражаньне ад сьвята засталося добрае. Бо да кожнага сьвята горад становіцца ўсё прыгажэйшым. Адзначыўшы летась 600-годзьдзе Докшыцаў, гэтую традыцыю не закінулі, нагадваючы людзям, што дадаўся яшчэ адзін год у слаўнай гісторыі нашага гораду.

**Міхась Зуброўскі,**
**Докшыцы**

## Па сьлядах Мар'яна Пецюкевіча

**29—30 верасьня сябры Таварыства беларускай культуры ў Літве разам з дачкой слыннага этнографа і беларускага дзеяча ў Заходняй Беларусі і Польшчы Мар'яна Пецюкевіча наведалі яго родныя мясьціны.**

Самым хвалюючым і запамінальным момантам для спадарыні Марыі было наведваньне Цяцерак, роднай вёскі бацькі. Там ёй пашчасьціла сустрэць людзей, якія яго памяталі. А на вясковых могілках у Барадзенічах, дзе спачываюць і продкі сямейства Пецюкевічаў, убачылі некалькі надпісаў на надмагільных помніках і на беларускай мове. І большасьць зь іх зроблена апошнім часам, пасьля 2000 г.

Значыць, для Беларусі яшчэ ня ўсё страчана, усьведамленьне таго, што і беларусы маюць права на сваю мову ня толькі ў хатнім ужытку, але значна шырэй, павялічваецца.

**Алесь Адамковіч, Вільня**

## Удакладненьне

**У «НН» №35'2008 на старонцы 10 «Пошта рэдакцыі» было зьмешчана ўзятае з сайту livejournal.com фота** абвесткі «Уже нынешнее поколение будет жить при социализме» з подпісам: «Гэта не архіўная хроніка. Такі лёзунг вісіць у Слуцку, у гімназіі № 1». Пасьля публікацыі ў Рэдакцыю зьвярнулася адміністрацыя слуцкай гімназіі №1 і аспрэчыла гэты факт. Рэдакцыі ўдалося скантактавацца з аўтарам фота. Ён паведаміў, што дакладна ня ведае, хто зьмясьціў абвестку на школьным інфармацыйным стэндзе і ці мае да гэтага дачыненьне кіраўніцтва школы. Абвестка была сфатаграфаваная ўвесну 2008 г.

## АБВЕСТКІ

### Зьбіраем матэрыялы пра гісторыю БНФ

20 гадоў таму мужныя людзі стварылі рух, які прывёў Беларусь да Незалежнасьці. Каб годна адзначыць юбілей Народнага Фронту, просім ахвяраваць у аргкамітэт сьвяткаваньня фота-, відэаматэрыялы, а таксама рэчы, зьвязаныя з гісторыяй БНФ. Сабраныя матэрыялы маюць быць ужытыя ў стварэньні выставы, вытворчасьці відэаролікаў, а таксама ў аздабленьні сьвяточнай друкаванай прадукцыі.

У прыватнасьці, шукаем:

фота — і відэаматэрыял з масавых акцыяў 1989—91 гг., Аргкамітэту 1988, Зьезду 1989 і 1991 гг., фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, выбарчай кампаніі 1994 г., альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў 1999 г., акцыяў і кампаніяў 1988—2008 гг.;

здымкі і іншыя матэрыялы пра заснавальнікаў БНФ;

узоры улётак, газэт і іншай прадукцыі, выпушчанай сябрамі ці прыхільнікамі БНФ;

Ласкава просім дасылаць матэрыялы на электронны адрас pbnf20@gmail.com, а таксама на адрас Сядзібы Партыі БНФ (20005, Менск, пр. Машэрава, 8)

Матэрыялы вы можаце таксама пакінуць у сакратароў сядзібы БНФ з панядзелка па пятніцы 10.00 па 20.00, падпісаўшы «Ў аргкамітэт 20-годзьдзя БНФ».

**Аргкамітэт**

### Конкурс студэнцкай паэзіі

Яна ня зьнікла разам з вагантамі і трубадурамі, а існуе і цяпер. Таму, калі ты адчуваеш у сабе творчыя сілы, далучайся да ўдзелу ў студэнцкім конкурсе «Незавершанасьць». Да 1 лістапада на vershyk@gmail.com дасылайце свае творы. Умовы конкурсу: беларуская мова; студэнцкая тэма; крэатыўнасьць.

Найлепшыя 30 вершаў будуць надрукаваныя ў зборніку, а 3 пераможцы атрымаюць прызы. Журы конкурсу — найлепшыя літаратары Беларусі.

**ПБ**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**



**Докшыцы з вышыні птушынага палёту.**

# Працуе выкладчыкам, зарабляе як тамада

Гісторык паводле адукацыі, супрацоўнік адной з ВНУ, назавем яго Мікола, у вольны ад асноўнага занятку час падпрацоўвае тамадом на вясельлях.

Весела, бо ж вясельле! Адказна і непрадказальна, бо адно нятрапнае слова тамады можа прывесьці да непрадбачаных наступстваў. І сумнавата, бо ўсё радзей на вясельлі запрашаюць бабуляў зь дзядулямі.

За час свайго тамадоўства Мікола пасьпеў патрапіць на два з гакам дзясяткі вясельляў па ўсёй Беларусі — ад вясковых да гарадзкіх, ад кампактных студэнцкіх да «трыста чалавек гасьцей». Як пачалося? Яго сябры вырашылі пабрацца шлюбам і не знайшлі сабе беларускамоўнага тамаду. І ён вырашыў паспрабаваць сябе ў гэтай ролі. Першыя вясельлі адпрацаваў задарма для блізкіх сяброў, а там і камэрцыйныя замовы пайшлі. Пасьля першых бліноў сабаку зьявіўся досьвед. Прапануем позірк на сучаснае беларускае вясельле вачыма тамады. Такім чынам, **вясельле — гэта...**

### ...весела.

Бо ж вясельле. І тамада мусіць быць блазнам. Але пры гэтым ня варта забывацца на галоўнае — не загуляцца так, што страціш годнасьць у вачах гасьцей, і найперш у сваіх. Музыка — адна з самых важных крыніцаў весялосьці. Мікола працуе не адзін, возіць з сабой музыкаў, часам госьці танчаць пад саксафон. Кружэлкавы рэпэртуар — гэта найперш любімая-нянавісная папса а-ля Сярдзючка, а ўвогуле — любая танцавальная музыка. Чым бліжэй да вечару, тым менш разборлівымі робяцца госьці. І гэта датычыцца ня толькі расейскамоўнай публікі. Беларускі рэпэртуар, на жаль, ня радуе, бо на цэлы вечар назьбіраць паўнавартасную праграму не атрымаецца. Часткова сытуацыю ратуе «Крамбамбуля». Ну не «Калгас» жа «зэтаўскі» людзям прапаноўваць, усьміхаецца тамада.

Мікола зьбірае вясельны рэпэртуар, кшталту нататніка маладога жаўнера. «Дарагія дзеці! Нягледзячы на тое, што ў вас сёньня вясельле, хачу...» — гэтак расхваляваная маці пачала віншаваць сваіх дзяцей са шлюбам.

### ...адказна.

Бо адно нятрапнае слова тамады можа прывесьці да непрадбачаных наступстваў. Трэба ведаць пра што можна, а пра што ня варта жартаваць, напрыклад, на вясельлі міліцыянтаў. «Гэта вясёлая і адукаваная, адэкватная публіка. Толькі міліцыянты ня любяць палітычных жартаў. Але з задавальненьнем удзельнічаюць у конкурсах з прымяненьнем фізычнай сілы — адціскаюцца ад падлогі, бегаюць і г.д.» — кажа малады тамада. Чаму ня любяць? Бо ў панядзелак начальству можа стаць вядома, хто першы засьмяяўся з палітычнага жарту. А на якіх вясельлях палітычныя жарты «йдуць»? Найлепей успрымаліся на прадпрымальніцкіх, згадвае Мікола.

Увогуле, вельмі важна загадзя даведацца пра колькасны і якасны склад гасьцей. Мікола прыгадвае досьвед свайго знаёмага, які вёў вясельле, дзе госьці дзяліліся на дзьве групы — баптысты і людзі з праблемамі слыху. Як для тамады, то невыканальная місія — адны ня п’юць, другія ня чуюць жартаў.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вясельныя традыцыі сучасных беларусаў уражваюць разнастайнасьцю.**

### ...непрадказальна.

Акурат непадрыхтаванасьць і згуляла зь Міколам дурны жарт на самым пачатку яго вясельнай кар’еры. За колькі месяцаў дамовіўся весьці вясельле, а пра месца не запытаўся. Калі сустрэўся са сваякамі маладых побач з адной са станцыяў мэтро і, сядаючы ў машыну, даведаўся, што ехаць трэба ў Маларыцкі раён, ледзь не самлеў ад такой неспадзяванкі. На месцы атрымаў вялікую порцыю ўражаньняў і карыснага досьведу. На адным краі стала колькі бабуляў паўдня аўтэнтычна сьпявалі «Горіла сосна, палала», побач зь імі амаль ня рухаючыся праседзеў дзяцюк у скуранцы паўзьверх сьвяточнага гарнітуру. Нехта раз-пораз шукаў нагоды даць у нос суседу. Тамаду амаль ніхто ня слухаў: ягоную літаратурную беларускую мову папросту ніхто не зразумеў.

Акрамя ўсяго, на любым вясельлі заўсёды знойдзецца хтосьці незадаволены. Хоць чым — і музыка не такая (ня буду я пад такое танчыць), і гарэлка нясмачная (у Колі на вясельлі была лепшая), і тамада ня тое гаворыць (лепей бы мне мікрафон далі).

### ...цяжка.

Праца тамады дае хуткія грошы — дзе яшчэ можаш зарабіць за вечар—другі да двух сотняў даляраў! Але гэты занятак — хутчэй на аматара. І справа тут не ў адукацыі. Трэба мець пэўны талент, пачуцьцё такту. Мікола мае ўласную праграму, якая, прызнаецца ён, не вызначаецца выключнай арыгінальнасьцю. Прынцыповы момант — ён заўсёды прапануе выбар мовы. Загадзя складае сьпіс гасьцей і, па магчымасьці, іх кароценькія характарыстыкі. Па яго назіраньнях, на 90% посьпех вечару залежыць ад жанчынаў. Трэба толькі падабраць адмысловы ключык да іх — найперш да мацярок. Мужчыны ж — самыя непрадказальныя. Ад іх таго і чакай, што нап’юцца ды пачнуць высьвятляць адносіны. Самая шчырая публіка, вядома ж, дзеці. І добры індыкатар працы тамады: ім калі сумна, то сумна, калі весела, то весела.

### ...сумна.

Бо ўсё радзей на свае вясельлі васямнаццаці-, ці дваццацігадовыя запрашаюць сваіх бабуляў зь дзядулямі. І нават сватоў ужо амаль няма. Гарадзкая публіка традыцыяў ня ведае і ведаць ня хоча. Але сухога афіцыёзу на вясельлі таксама не жадае і патрабуе цікавостак. Пры гэтым, баючыся, каб калярыт народны занадта не вытыркаўся (як жа гэта — новы дарагі «Мэрсэдэс» ды зернем пасыпаць!), абмяжоўваецца асобнымі традыцыйнымі элемэнтамі.

### ...пазытыўна.

Хай і ня часта, але ладзіць наш тамада вясельлі для беларускамоўнай публікі. Ёсьць маладыя людзі, што прагнуць традыцыяў. А самае галоўнае — ім ёсьць каго запрасіць!

**Сямён Печанка**

# БТ: Баю-бай, старая «Калыханка»!

Фанаты «Калыханкі» больш ня змогуць штовечар слухаць улюбёную мэлёдыю і звыклыя словы пра зоркі-сплюшкі і паснулыя ў гаражы машыны. Замест узвычаенай змалку песьні Ядзьвігі Паплаўскай у эфіры тэлеканалу «Лад» будзе гучаць новы твор у выкананьні Ірыны Дарафеевай.

Словы да новай песьні напісаў Алег Жукаў, а музыку — Ізмаіл Капланаў. Першапачаткова песьня была запісаная па-расейску, але пастанавілі, што ў дадзеным выпадку білінгвізм (сама перадача ідзе па-беларуску) недарэчны. Ірына перапяяла «Калыханку» на роднай мове. Для новай калыханкі быў зроблены мульціплікацыйны ролік. Сюжэт — хлопчык і дзяўчынка трапляюць у дзівосную краіну сноў.

Музыка і радыёвядоўца Аляксандар Памідораў прызнаецца, што ў дзяцінстве яму «Калыханка» была не даспадобы. «Надта яна нейкая саладзенькая была, як патака. Але з мастаткага гледзішча — няма чаго і казаць: цёця Ядзя сьпявала сваю «Калыханку» значна лепей за Ірыну Дарафееву».

Гулец барысаўскага БАТЭ і моладзевай зборнай Сяргей Крывец лічыць, што заўсёды трэба нешта мяняць у жыцьці і спадзяецца, што новая будзе лепей за старую. «Але, безумоўна, старая «Калыханка» застанецца ў памяці — яна мне падабалася ў дзяцінстве».

Музычны крытык Зьміцер Падбярэскі лічыць, што старая «Калыханка» была годным творам. «Яна як найлепш адпавядала атмасфэры перадачы, была адметная. Песьня на словы Бураўкіна і з музыкай Раінчыка — наш культурны набытак. Яна пайшла ў народ, а беларускія музыкі ня раз абыгрывалі яе словы, выкарыстоўвалі гэтую запамінальную мэлёдыю. Разумею, час ад часу зьмены патрэбныя. Але ў дадзеным выпадку варта было пераадолець памкненьне мяняць. Усё ж варта было б трымацца традыцыяў, бо гэтая песьня — сапраўдная каштоўнасьць».

**Павал Касьцюкевіч**

# Свабодны тэатар уразіў «Бандароўнай»

Гаворка не пра менчукоў. Гэта чарговы спэктакль берасьцейскіх самадзейных артыстаў. Але многія ходзяць на шосты паказ як на першы. Пад Новы год таленавітыя самавукі хочуць паставіць «Працэс» Кафкі. Піша **Пётра Васілеўскі**.

Мяне цяжка зьдзівіць, але яны зьдзівілі. Гэта фэерыя, як ні паглядзі. Дынамічнае шоў з агнявымі танцамі — гэта па сутнасьці. А па форме — вакол вогнішча, з вогнедыханьнем спачатку чорных сілаў — пана Патоцкага, а потым і сялян, якія яго раззброілі. Адным словам, ёсьць такая ангельская каманда: Fire! Агонь! Агонь па застыгласьці! Агонь па замбізьме! Агонь па мяшчанстве! Па несвабодзе агонь!

На спэктакль публіка трапіла, у асноўным, празь сяброў ды знаёмых. Некаторыя праз інтэрнэт. Я вось выпадкова праз афішу. Думаў, да майго сораму, што прыехаў на гастролі менскі Свабодны, але выйшла, што ёсьць і свае — і я пра іх ня ведаю.

Акторы маладога веку. Рэжысёрка Аксана Гайко расказала пасьля спэктаклю, што растуць разам як тэатар ужо сем гадоў.

Гурт невялікі — сем чалавек. Самадзейныя самавукі. Зачапіліся за падмосткі ў клюбе на Вульцы — «малая воля», так называецца былая берасьцейская слабодка, якую яшчэ не да канца пракаўтнула Берасьце Панэльскае.

Вучацца, што называецца, па ходу — езьдзяць на фэстывалі за мяжу, у асноўным, у Польшчу, падглядаюць, як працуюць прафэсійныя акторы.

### Пра Бандароўну

Спэктакль рэалізуе задуму сродкамі мадэрну з украпваньнем традыцыйных тэатральных прыёмаў, настолькі арганічна ўплеценых у фэерыю, што ўражаньне сьвежасьці і навіны толькі большае. Фальклёрныя матывы — што заўгодна, толькі не зацяганыя падвываньні бяззубых старых кабетаў з афіцыйных лубачных аповедаў пра беларускі скансэн. Найперш гэта датычыць галашэньня па зьмерлай Бандароўне.

Усё зьвязвае жывая ніць пластычнага рознарытмавага танцу. Не спудлаваў тут Андрэй Багданаў, які падабраў на кампутары файны саўнд-трэк. Тэхнічнае суправаджэньне, як для абласнога цэнтру, дык вельмі нішто сабе. А пры канцы ўступаюць ужывую ўдарныя — і гэта класна!

Дзея разварочваецца на адкрытым паветры. Роўны луг у двары клюбу, людзі чалавек дзьвесьце колам, кола замыкаецца на дэкарацыі — палатняная парт'ера пяць на два з паловай, пасярэдзіне нейкі круглы твар страшны з разяўленым ротам, крыху мілейшы за Мэдузу Гаргону, празь яго і збоку парт'еры выходзяць да гледачоў і вяртаюцца акторы.

Вогнішча. Вакол яго басанож пры плюс шасьці па траве, вільготнай ад нядаўняга дажджу, у танцы рушаць чацьвёра, двое — «ён і яна» — у зрэбным. Маладыя сяляне. Перакідваюцца жывёламі, буслямі. Паганства! Купальле! Пан да пары прагульваецца за сьпінамі гледачоў зь бізуном і страшным тварам-маскай. Нагнятае жах самнамбулічнымі рухамі ды паказкамі і — уступае ў кола, крыўдзіць і тыраніць. Раскідае касьцюм Буслу, палохае дзявулю, крыўляе. Словаў вобмаль, толькі скокі, мова жэстаў — суцэльнае імпрэсіё.

Шакуюча зьяўляецца Пан у другой зьяве — паўзы няма, ён вось быў двухмэтровае пужалава, сышоў за дэкарацыю — і вось ужо з-па-над яе выторкваецца чатырохмэтровае боўдзіла — Патоцкі на хадулях! Цалкам дамінуе над сваімі ахвярамі, над Бандароўнай, тыраніць, звадзіць, гвалтуе. Абсалютна ўражвальная мізансцэна! І абсалютная алюзія сучаснасьці.

Жудліва памірае скрыўджаная Бандароўна. Застыглы яе труп ставяць старчака, убіраюць у строі пахавальныя зь вянком нявесты. Вось дзе пачынаецца беларуская містыка а-ля Гогаль! І — пераломам у дамінацыі Пана. Бо ён баіцца Бандароўны, як яна замбічна рушыць на яго і пачынае гнобіць ягоную аўру. Ажываюць упоравень з гэтым другія скрыўджаныя сяляне-пахаджане, у іх рухах зьяўляецца сэнс. Пан падпальвае нейкую зброю, дыхае-плюецца агнём з свае чатырохмэтровае вышыні — ды пайшоў яго час на ўбытак. Зноў алюзія.



А пры канцы тэатральная дыскатэка! Ажывае й выходзіць з-за Мэдузы Бандароўна. Побач стаў і кланяецца публіцы — у, гада кусок — Пан. Публіка навыперадкі прэ ў капялюш на лузе грошы за спэктакль, становіцца ў кола і танчыць, танчыць вакол вогнішча расхрыстанае сьвята вызваленьня. Пяць хвілін, і дзесяць, і пятнаццаць — і вось ужо верыцца, што гэта будзе да сьвітанку.

### Здымкі

І што ў апэратараў аднаго вядомага беларускага замежнага тэлеканалу ня хопіць памяці ў камэры. Бубначы было сыціхлі, народ паверыў на сэкунду — але самы адчайны з хлопцаў — гэх! — урэзаў зноў па бубне, яго напарнік рассыпаў маракасы, трэці падхапіў яшчэ па нечым плоскім — і панесьліся зноў у нейкай імправізаванай літвінцы акторы і гледачы.

Увесь спэктакль народ у коле падымае хто лічбавік, хто проста мабільнік і фатаграфуюць — страшнога Пана, пластычныя групы, вогнедышных Патоцкага і ягонага пераможцу і — факт! — Бандароўну. Дый Аксану Гайко.

### Гайко

Рэжысёрка маладая і, колькі яе помню, свабодалюбная. З такое любові і вырас такі вось незвычайны тэатар.

Малады і — непрымітыўны. Нават рафінаваны.

Аксана кажа, сталічны Свабодны перажывае за брэнд. Нездарма, думаю сабе. Але ж мы з Вулькі, мы першасна вольныя, Свабодныя. Акапаліся тут і не бярэм асабліва да галавы.

Гурт у іх сяброўска-сямейны. Адзін з самых пластычных танцоўшчыкаў гурту — Аксанін муж Сяргей. А непадробны пан Патоцкі — яе брат Алег.

Падыходзіць высокі хлапчына з доўгімі бялявымі валасамі. Танчыў надоечы як апантаны. Дзякуе Аксане, яны па-сяброўску абдымаюцца. Думаў, кажу, гэта ваш актор — надта танчыў прафэсійна. Ды не, кажа ўзуваючы кеды Аксана, ужо разоў шэсьць ставілі «Бандароўну», дык ён ні разу не прапусьціў. Мы ўжо і пасябравалі.

Аксана кажа, чытала «Шаршні» Пэтэра Гандке ў часопісе ARCHE. Мабыць, прыцэньваецца. Што ж, твор шызоідны, амбівалентны. І, як і ўсё крылатае, палётны. Але яна агучвае іншую задуму.

— Пад Новы год мяркуем паставіць «Працэс» Кафкі. Гэта будзе варыянт indoor — больш не на адкрытым паветры.

А Вас, раз ня ведалі пра нас, заносім у рассылку.

Буду ўзаемна ветлівы і даю адрас сайту гэтай сямёркі: www.svabodny.kantakt.net.

Будзе нагода паглядзець «Бандароўну» — выбірайцеся і ня думайце! Такое відовішча ня тое што ў Польшчу — куды заўгодна везьці ня шкода, будзь я антрэпрэнёрам, камэрц-дырэктарам ці яшчэ якім там мэнэджарам.

# «Ляпісы» сталі панкамі

Гурт «Ляпіс Трубяцкой» запісаў альбом-падзею, які поўніцца правакацыямі, нечаканасьцямі ды супярэчнасьцямі. Яны паказалі смачны фак усяму шоў-бізу, цалкам паклалі на фармат ды паліткарэктнасьць ды залагодзілі беларускамоўную аўдыторыю. Піша **Сяргей Будкін**.

«Маніфэст» пададзены нават не з іроніяй, а з панкаўскай злосьцю. Найлепшы прыклад таму нават ня Belarus Freedom, які напраўду можа стаць патрыятычным рок-гімнам усяе Беларусі, а песьня «Кліп», дзе «сцэнарыст» Міхалок прапануе зьняць ролік пра жырафа, які сікае, скача з даху ЦУМу ды заляtae ў чыноўніцкі кабінэт, дзе «Грыгорыча партрэт».

Нельга не адзначыць і эвалюцыю Міхалка беларускамоўнага. На пачатку сваёй кар'еры ён выкарыстоўваў беларускую мову як элемэнт сьцёбу, калі зацягваў «Дзе жа ты маё, каханьне» голасам «пад Данчыка». Цяпер іншая халера — несур'ёзна сьпяваць па-беларуску Міхалок развучыўся — пэўна, Зелянкоўская паўплывала:).

«Зорачкі» ды Belarus Freedom на «Маніфэсьце» — самыя сур'ёзныя песьні.

Засталося толькі пажадаць Сяргею папаўняць свой слоўнікавы запас. Калі б яшчэ загалоўны трэк загучаў па-беларуску, яго сьмела можна было б назваць «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» XXI стагодзьдзя.

Belarus Freedom наагул дзівіць вастрынёй, бо Міхалок пры ўсёй сваёй зубатасьці заўжды стаяў на сьцежцы паліткарэктнасьці. За выключэньнем хіба даўняга кавэру на песьню зь фільму «Прыгоды Бураціна», дзе ў прыпеве замест імя казачнага пэрсанажа прапявалася: «Лу-ка-шэн-ка!»

На «Маніфэсьце» больш нэрву, чым у якім іншым альбоме самай «прасунутай» беларускай каманды. Зьвыклая духавая сэкцыя засталася на месцы, але «каліфарнійскага бруду» пабольшала значна.

Яшчэ б крыху — і музыку «Ляпіса» можна было бы назваць сумесьсю No Smoking Orchestra і Ramones.

Зрэшты, застануцца задаволенымі і тыя, хто лічыць найлепшым у дыскаграфіі «Ляпісаў» альбом «Залатыя яйцы», і нават тыя, хто фанацеюць па «Ты кінула». Але песенькай «Рыбка залатая» на манер сваіх клясычных гітоў а-ля «В платье белом» Міхалок проста засьведчыў: маўляў, я так магу пісаць, проста тое ўжо малацікава.

І як вынік — абразае песьню да куплету з прыпевам.

Урэшце тое, што пляваць ён хацеў на ўмоўнасьці, Міхалок пацьвердзіў і сваім рашэньнем выкласьці альбом для бясплатнага спампоўваньня ў інтэрнэт.

**Сяргей Будкін**




**У новым кліпе «Ляпісаў» у ролі электарату зьняліся 300 кароваў**

Здымкі гэтага кліпу сталі самымі маштабнымі за ўсю гісторыю гурта. Для адной з сцэнаў у калгасе пад Менскам быў арандаваны статак кароваў у трыста галоваў з двума пастухамі і сабакамі. У іншым эпізодзе зьняліся роўна 50 сьвіньняў, таксама ў здымачным працэсе былі задзейнічаныя сапраўдныя алені, зайцы, бабры і яноты.

Усе гэтыя жывёлы сыгралі ролю электарату, перад якім выступаў зь перадвыбарнай прамовай «палітык» Сяргей Міхалок.

**Паводле www.lyapis.com**

# Гарадзенскія парадоксы нямецкімі вачыма

Знаёмцеся — **Фэлікс Акерман**, аўтар нядаўна абароненай у Нямеччыне доктарскай дысэртацыі на тэму дэмаграфічных зьменаў у Горадні ў XX стагодзьдзі. Зь нямецкім гісторыкам, які піша па-беларуску, гутарыць **Павал Касьцюкевіч**.



**Фэлікс Акерман**
гісторык, дасьледуе тэму дэмаграфічных зьменаў у Горадні ў XX ст. Жыве ў Бэрліне. «НН» друкавала яго тэкст «Пошта з Трэблінкі» ў №4 за 2007 год.

**«НН»: Традыцыйнае для нашых шыротаў пытаньне: адкуль беларуская мова?**

**Фэлікс Акерман:** З Горадні. Але перадгісторыя такая: сьпярша я вучыўся ў Польшчы, дзе асягаў польскую. Потым праходзіў альтэрнатыўную службу ў Расеі. Па вяртаньні ў Нямеччыну, ужо займаючыся савецкай і польскай тэматыкай, захапіўся гісторыяй краіны, якая ляжала, так бы мовіць, на скрыжаваньні маіх зацікаўленьняў. Потым часта езьдзіў у Беларусь — напісаў дысэртацыю пра міжваенную Горадню, пра міжэтнічныя адносіны ў ёй падчас Другой сусьветнай вайны.

Адну шостую частку жыцьця, пяць гадоў, вывучаў, які чынам пасьля Галакосту і адыходу Польшчы Горадня перастала быць такой стракатай з этнічнага гледзішча і як зрабілася савецкай. Як Горадня, дзякуючы вёсцы, што прыйшла ў горад, станавілася ўжо дашчэнту беларускай з аднаго боку, але зь іншага боку як добраахвотна пераходзіла на расейскую мову.

Менавіта ў Горадні ў мяне ўзьнікла пытаньне, як так здарылася, што беларусы не размаўляюць на беларускай мове — можа, трохі такое наіўнае пытаньне як на тутэйшага жыхара.

І так, пакрысе, дасьледуючы, чаму беларусы не гавораць па-беларуску, я вывучыў беларускую мову.

У дадатак, я ўжо ведаю ўсе тонкасьці моўнай сытуацыі ў Беларусі: дзе сёньня можна размаўляць на мове, а дзе гэта — бессэнсоўна. Ведаю, што падобны стан і ў іншых беларускіх гарадах. Сытуацыя, з навуковага гледзішча, вядома, — досыць цікавая, але трэба прызнаць — шызафрэнічная.

**«НН»: А яшчэ якія гістарычныя праблемы Вас цікавяць?**

**ФА:** Этнічныя ўзаемаадносіны і нацыянальная тоеснасьць у Горадні. Тут гэтае беларуска-польска-літоўскае памежжа вельмі адчуваецца. Да Горадні вельмі пасуе мэтафара палімпсэсту, прасторы, у якую розныя стагодзьдзі ўпісвалі свой кштальт. Тут мяне цікавіць ня толькі адшукваньне гэтых слаёў, але і вывучэньне самаідэнтыфікацыі жыхароў — самаідэнтыфікацыя шматслойная. Лічу, што калі ў сёньняшніх людзей ёсьць магчымасьць выбару сваёй нацыянальнай прыналежнасьці — факт сам па сабе вельмі цікавы. Што і цешыць мяне як дасьледчыка.

І так, пакрысе, дасьледуючы, чаму беларусы не гавораць па-беларуску, я вывучыў беларускую мову.

Ведаю шмат гарадзенцаў, якія пад уплывам розных сацыяльных і гістарычных працэсаў на некалькі разоў мянялі погляд на ўласную нацыянальную прыналежнасьць.

А яшчэ, займаючыся гісторыяй Горадні, заўважыў, што няма добра напісаных гістарычных працаў пра гарадзкое жыцьцё падчас Другой сусьветнай вайны. Ёсьць савецкая міфалёгія пра Вялікую айчынную вайну, але ўсё гэта ня вельмі каб навукова. А Горадня вартая мець добра напісаную гісторыю. Усё ж некаранаваная сталіца ВКЛ, улюбёнка Сьцяпана Батуры. Наяўнасьць каралеўскага замку абавязвае.

**«НН»: Адмысловая гарадзенская атмасфэра?**

**ФА:** Тут, відаць, павінны актывізавацца мой лякальны патрыятызм? (*сьмяецца*). Цікава займацца старой Горадняй, хіба таму што яна ўвогуле захавалася ў адрозьненьне ад разбураных старога Віцебску ці старога Берасьця. Нешта тут усё ж тоіцца. Першае ўражаньне ад гораду самае прывабнае: вузенькія вулачкі, касьцёлы, Гарадніца... Але калі знаходзісься ў Горадні ня першы месяц, то гэтая аўра трохі блякне — шэрасьці стае і тут.

На маю думку, цяпер хутчэй сама барацьба за гістарычны цэнтар і надае гораду адмысловую атмасфэру.

Сёньня мяне вабяць найбольш не гарадзкія краявіды, а самі гарадзенцы, якія нарэшце сказалі, што «гэта наш горад, і мы хочам абараняць яго». Разумееце, надзіць сам факт змаганьня, бо за савецкім часам, пры ўсёй маёй павазе да тагачасных дзеячаў культуры, нічога асаблівага для гораду не рабілася. Гэта вельмі важны момант. І хаця ў цяперашніх актывістаў сілаў няшмат, няма і вялікага ўплыву на падзеі, але сёньня яны ствараюць падмуркі, захоўваюць, як могуць, Горадню для будучыні, працягваюць кшталтаваць гарадзенскую міфалёгію.

**«НН»: Вы кажаце: не рабілася. А гарадзенец Васіль Быкаў?**

**ФА:** Так, сапраўды, Васіль Быкаў жыў тут шмат гадоў, вёў літаратурную старонку ў «Гродзенскай праўдзе». Але ж — зноўку, бачыце — парадокс: калі прыгледзецца, дык акрамя літаратурнай дзейнасьці ён нічога такога адметнага для беларускасьці гораду не зрабіў.

Іншая рэч, што пасьля яго сьмерці Горадня магла сама вярнуць даніну павагі вялікаму пісьменьніку і адначасова зрабіць карысную для сябе справу — далучыць Быкава да пантэону гарадзенскіх легендаў.

І што мы маем сёньня? Музэю годнага няма, невялікі пакоік, нават вуліца ў гонар вялікага пісьменьніка адсутнічае.

**«НН»: Фэлікс, цяпер трохі пра іншае — пра беларускую культурную прысутнасьць у Нямеччыне. Ці адчуваецца яна? «Крыві» папулярны ў Бэрліне? Раман Клінава, які, перш чым пабачыць сьвет па-беларуску, быў выдадзены па-нямецку?**

**ФА:** «Крыві» папулярны ў Бэрліне не таму што ён беларускі, а таму што яны граюць шыкоўны фолк і попыт на іх менавіта сярод фолкавых асяродкаў, сярод аматараў аўтэнтыкі. Канечне, у Нямеччыне ёсьць кола, якое цікавіцца Беларусьсю. У звычайных кнігарнях я раману Клінава ня бачыў, але ёсьць ён у інтэрнэт-крамах. Але калі зусім шчыра, то для немца Беларусь існуе пад шыльдай «Апошняя дыктатура Эўропы», і пакуль нічога тут не зьмянілася.

Для немца Беларусь існуе пад шыльдай «Апошняя дыктатура Эўропы», і пакуль нічога тут не зьмянілася.

Вось на выбары прыяжджалі нямецкія карэспандэнты з Масквы, з Варшавы на дзень-два і назад... Шкада, але ўсё беларускае ў Нямеччыне прымаецца праз прызму палітычнага.

Наагул кажучы, трэба больш рэалістычна глядзець на справу, улічыць усе заганы і перавагі цяперашняга становішча. І «няіснасьць», або «адсутнасьць» Беларусі можна ператварыць у перавагу.

Усім аматарам прасоўваць беларускую культуру за мяжой, можна параіць, каб яны пачыналі свой дыялёг зь нямецкай публікай наступнымі словамі: «Давайце мы вам распавядзем пра краіну, якой не існуе».

І немцам гэты пасыл будзе цікавы.

## СЬЦІСЛА

### Казімер Малевіч, дорага



Намаляваная Казімерам Малевічам у 1916 г. «Супрэматычная кампазіцыя» будзе выстаўленая на продаж у Нью-Ёрку на аўкцыёне Sotheby's з ацэнкай 60 мільёнаў даляраў. «Супрэматычная кампазіцыя» – адзін са знакавых твораў авангардызму. Па вяртаньні Малевіча ў СССР, карціна захоўвалася ў Бэрліне, а потым апынулася ў архітэктара Гуго Херынга, які прадаў яе ў амстэрдамскі гарадскі музэй. Пасьля шматгадовых судовых спрэчак карціна была вернутая нашчадкам мастака. Нью-ёрскія таргі маюць адбыцца 3 лістапада.

### Уладзімер Арлоў. Паўстанцы

Уладзімер Арлоў выдаў новую, пятую па ліку, аўдыёкнігу. Зьмешчаныя ў ёй гістарычныя эсэ не выходзілі ў папяровым фармаце. Касьцюшкоўцы, каліноўцы, случакі — іх вобразы паўстануць перад слухачамі дыску.

### Кустурыца не прыедзе

Анансаваны раней прыезд у Менск на кінафэстываль «Лістапад» 15—22 лістапада рэжысёра Эміра Кустурыцы не адбудзецца. Затое мае быць Кшыштаф Занусі.

**Лявон К, паводле tut.by**

# Майстры прафэсіі

## «Спортивная панорама» перафарбавала сьцяг БАТЭ ў чырвона-зялёны

Нумар афіцыйнай газэты «Спортивная панорама» за 3 кастрычніка на першай бачыне цешыў загалоўкам «Нічыя, роўная перамозе». Прысьвечаны анансаваны матэрыял быў матчу БАТЭ — «Ювэнтус».

Матэрыял суправаджаўся фатаздымкам. Ва ўсю шырыню бачыны былі адлюстраваныя заўзятары БАТЭ. Аднак сёетое паказалася дзіўным.

Толькі газэта зьявілася ў продажы, на інтэрнэт-рэсурсах, прысьвечаных барысаўскім заўзятарам, стала ўздымацца хваля абурэньня. Аказалася, журналісты «СП» памянялі на фота колер клюбных сьцягаў БАТЭ, якія трымалі ў руках заўзятары. Колер штандараў зьмяніўся з жоўта-сіня-жоўтага на чырвона-зялёны.



Вось такі фотакаляж надрукавала «Спортивная панорама».

Абурэньню заўзятараў не было межаў: «Гэта ж зьдзек з клюбных колераў. Клюб павінен забраць акрэдытацыю ў гэтых калгасьнікаў на матчы лігі!», «З такім посьпехам нам маглі дамаляваць якуюсьці варожую сымболіку, напрыклад, а потым выдаць за экстрэмістаў. Ці падмаляваць аўтаматы і сказаць, што мы «Аль-Каіда!»

«З чым гэта зьвязана?» — узьнікла пытаньне. Прошукі БРСМ? Схаваная нелюбоў рэдактараў «СП» да БАТЭ?

Але падобна самы дасьціпны і ў той жа час падобны да праўды адказ знайшоўся на адным з інтэрнэт-форумаў: «Сапраўды, у чорна-белым варыянце глядзіцца зусім па-іншаму».

Галоўны рэдактар «Спортивной панорамы» Віктар Рабінін пракамэнтаваў для kp.by замену колеру сьцягоў: «Тое, што некаторыя пасьпяшаліся назваць фатаздымкам, насамрэч называецца фотакаляжам. Мы лічым, што нічыя нашага БАТЭ з «Ювэнтусам» — гэта ня толькі дасягненьне гэтага барысаўскага клюба, але і дасягненьне ўсяго беларускага футболу. І нашай спартовай дзяржавы цалкам.

Ёсьць рэчы, якімі пакрыўдзіць нікога нельга. Нельга ж пакрыўдзіць любоўю, ветлівасьцю ці тым болей дзяржаўнай сымболікай», — лічыць В.Рабінін.

**Дзьмітры Гаўрусёў, football.by**



FOOTBALL.BY

А вось так жоўта-сіня-жоўтыя сьцягі БАТЭ глядзяцца ў чорна-белым варыянце.

### У Глускім раёне забіты трохгадовы хлопчык

У вёсцы Бярозаўка Глускага раёну забіты трохгадовы хлопчык. Труп хлопчыка з шматлікімі ранкамі і сінякамі быў знойдзены 29 верасьня. Сьмерць наступіла ад чэрапна-мазгавой траўмы. Папярэдне ўстаноўлена, што хлопчыка зьбіў 29-гадовы айчым, які знаходзіўся ў стане алькагольнага ап’яненьня. Ёсьць інфармацыя, што гэта адбылося пасьля сваркі з маці хлопчыка. Падазраваны затрыманы.

### Брат згвалтаваў сёстраў?

У пракуратуру Рагачоўскага раёну зьвярнулася жыхарка адной зь вёсак з заявай аб тым, што яе сямнаццацігадовы сын згвалтаваў сваіх сёстраў, 1995 і 1996 гадоў нараджэньня. Брат і сёстры, як гаворыцца ў народзе, зводныя. Ад розных бацькоў. У сям’і «галавой» зьяўляецца маці, бо ніводнага мужчыны, акрамя сына, у ёй няма. Маці вельмі працавітая жанчына, а сын то працуе, то не, але ж добра зарабляе, а грошы траціць у асноўным на сябе. Ён прызнаўся, што адну сястру сапраўды згвалтаваў. Наконт жа другой пакуль маўчыць. Узбуджана крымінальная справа. Вядзецца сьледзтва.

### У Ветцы п’яны кіроўца зьбіў пяцёх дзяцей

Аўтамабіль, якім кіраваў мясцовы жыхар 1974 года нараджэння, вадзіцель Веткаўскага райспажыўтаварыства, рухаўся па вуліцы Савецкая. На неасветленым участку дарогі ён збіў чатырох хлопчыкаў 10, 12, 13 і 15 гадоў і 14-гадовую дзяўчынку. Вадзіцель уцёк зь месца здарэньня. Дзяцей знайшлі прахожыя, усе яны былі дастаўлены ў бальніцу зь цяжкімі траўмамі. Дзесяцігадовы хлопчык памёр. Вадзіцель затрыманы.

### Мітрапаліт Кандрусевіч асьвяціць касьцёл у Парыжы

12 кастрычніка мае адбыцца асьвячэньне касьцёла ў вёсцы Парыж (Пастаўскі р-н). Мяркуецца, што ў ім возьме ўдзел мітрапаліт Менскі і Магілёўскі, арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

### У Сеньненскім раёне Дзень цьвярозасьці

У Сеньненскім раёне 4 кастрычніка прайшоў Дзень цьвярозасьці ў сувязі з правядзеньнем марафону памяці Пятра Машэрава. Марафон, прысьвечаны памяці былога старшыні ЦК КП Беларусі, ураджэнца вёскі Шыркі Сеньненскага раёну, праводзіцца ўжо дваццаты раз.

Ён складаецца з трох забегаў: на 3 км, па вуліцах гораду, а таксама на 5 і 10 км у прыгараднай зоне.

### Паабедаў грыбамі галюцынагеннымі

Зазірнуўшы ў інтэрнэт, 23-гадовы хлопец знайшоў старонку, на якой расказвалася пра галюцынагенныя грыбы. Хлопец назьбіраў тых грыбоў у полі і зьеў сырымі больш за сорак, а вечарам яму стала блага. Калі б «хуткая дапамога» не даставіла экспэрымэнтатара ў бальніцу, то ён мог бы памерці.

### Землятрус у Кіргізіі: 58 чалавек загінулі

Магутны землятрус адбыўся ў Рэспубліцы Кыргызстан на мяжы з Таджыкістанам і Узбэкістанам. Загінулі 58 чалавек. Сіла штуршкоў перавысіла 8 балаў.

### Амэрыканская трагедыя

Беспрацоўны фінансіст забіў жонку, траіх дзяцей і цешчу, а потым скончыў жыцьцё самагубствам.

Гэта здарылася ў Каліфорніі, у Сан-Фэрнанда. Цягам некалькіх месяцаў гэты чалавек ня мог знайсьці працу, хоць да гэтага быў супрацоўнікам некалькіх буйных кампаній. Як перадае CNN, у перадсьмяротнай цыдулцы ён напісаў, што бярэ на сябе адказнасьць за забойства і што прычынай гэтага ўчынку ёсьць фінансавыя цяжкасьці, якія зваліліся на яго.

### Заробак 9 даляраў за сэкунду

Джаан Роўлінг — самы высокааплатны пісьменьнік у сьвеце, паведамляе часопіс Forbes. Штосэкунду яна зарабляе 5 фунтаў (каля 9 даляраў).

Аўтарка кнігаў пра хлопчыка-чараўніка Гары Потэра, першая зь якіх выйшла ў сьвет у 1997 г., за 2007 год зарабіла агулам 300 млн даляраў.

Ейны даход у шэсьць разоў перавышае даход пісьменьніка, што знаходзіцца на 2-м месцы — Джэймза Патэрсана, аўтара знакамітага баевіка «І прыйшоў павук…».

### Самы прыгожы мужчына сьвету

Пераможцам конкурсу на тытул самага прыгожага мужчыны сьвету — Mister World Mundial 2008, які прайшоў у Пэру, стаў 19-гадовы бэльгіец Ёхэн Вертэсен **(на фота ўнізе)**. У фінале конкурсу прыгажосьці сярод мужчын бралі ўдзел прадстаўнікі 25 краін. Бэльгіец, які вывучае маркетынг, таксама ўдастоены тытулу «Мужчына з самай прыгожай усьмешкай». Бэльгійскія СМІ зазначылі, што на леташнім конкурсе Mister World Mundial



прадстаўнік іх краіны заняў другое месца.

### Ацяпленьне па-галяндзку

Пакуль у Беларусі чакаюць пачатку ацяпляльнага сэзону, у Нідэрляндах знайшлі бясплатную крыніцу гарачай вады.

Геатэрмальная станцыя ў мястэчку Хеерлен — першая ў сьвеце, якая награе ваду ў скарыстаных шахтах. Экалягічна чыстая бясплатная энэргія бярэцца з глыбіняў Зямлі. Станцыя пампуе ваду са ствалоў выпрацаваных шахтаў глыбінёй 800 м, дзе вада натуральна награецца да +35 ад гарачыні зямных нетраў. Гарачая вада выкарыстоўваецца для ацяпленьня 350 будынкаў, пасьля чаго заліваецца назад у шахту, дзе зноўку награецца.

Тэхналёгія не дае шкодных выкідаў і можа адрадзіць іншыя шахцёрскія раёны, даючы танную невычарпальную энэргію. Адзіная хіба — будынкі мусяць стаяць дастаткова блізка да шахтаў.

### Накарміў кракадзіла

Кашмарную ноч перажылі ўчора насельнікі тэрарыюму ў заапарку аўстралійскага гораду Эліс-Спрынг. Камэры службы бясьпекі зафіксавалі, як 7-гадовы хлопчык пракраўся на досьвітку ў павільён, дзе выцягнуў рукой трох рэдкіх яшчарак, а потым скарміў іх кракадзілу. Але гэтым хлопчык не задаволіўся: шпурнуў яшчэ да алігатара дзесяць жывых чарапахаў. Дырэкцыя заапарку зьбіраецца падаць у суд на бацькоў хлопчыка.

### З кранаў пайшло шампанскае

Сьвята збору вінаграду ў італьянскім мястэчку Марына пад Рымам скончылася нетыпова.

Згодна з традыцыяй, у самы ўрачысты момант з фантану на галоўным пляцы Марына мусіла заструменіць віно. Але гідраўліка выкінула нечаканую штуку — віно пайшло ў дамы месьцічаў, паведамляе газэта Il Messaggero.

Тысячы людзей, як патрабуе звычай, з кубкамі ў руках сабраліся каля ўпрыгожанага кветкамі фантану ў чаканьні кульмінацыі сьвята. Аднак віно так і не паплыло.

У найлепшай сытуацыі апынуліся тыя нешматлікія жыхары, што засталіся дома — зь іх кранаў раптам пайшло белае шампанскае найлепшай якасьці.

**ЛК, ЯС, СП, паводле БелаПАН, АР, «Звязды»**

## КАНЦЭРТЫ

**Алоўнікаў іграе Шапэна**

**13 кастрычніка а 19-й у Філярмоніі** — канцэрт фартэпіяннай музыкі з твораў Ф.Шапэна ў выкананьні народнага артыста Беларусі Ігара Алоўнікава.

**Зьміцер Вайцюшкевіч**

**10 кастрычніка ў «Графіці» (зав.Калініна, 16) а 20-й** — «Восеньскі канцэрт» Зьмітра Вайцюшкевіча.

**Рокаш у «Графіці»**

**13 кастрычніка ў «Графіці»** — канцэрт фолк-рок-гурта «Рокаш». **Пачатак а 20-й.**

**Адпачні культурна**

**11 кастрычніка** ў межах кампаніі «Будзьма!» гурт **Mauzer** выступіць **у Віцебску**. На гэты раз улюбёнцы віцебскай публікі, гурт, пад які адрываліся самыя спакойныя і дарослыя наведнікі канцэртаў, выступіць **у клюбе «Зэбра»** разам зь віцебскімі гуртамі **Chi Wanga** і **Hellocost**. Інфармацыя: (029) 323-98-46, (029) 712-11-11.

**Riviera**

**15 кастрычніка ў Філярмоніі** — канцэрт квартэту драўляных духавых інструмэнтаў Riviera. У праграме творы Баха, Вівальдзі, Моцарта, Бізэ, Расіні, Пэргалезі, Мусарскага, Шастаковіча, Вагнэра, Глебава.

**Адбор у «Рок-школу»**

**27 кастрычніка ў клюбе «Гудвін» (пр.Незалежнасьці, 19)** пройдзе адборачны канцэрт у праект «Рок-школа». Даведкі па т.: (029) 649-08-88.

**«Крама» ў «Рэактары»**

**14 лістапада ў клюбе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** пройдзе вялікі сольны канцэрт гурту «Крама». Гіты і новыя песьні! Кошт квіткоў ад 15 000 да 40 000. Даведкі па т.: (029) 649-08-88.

**Разьбітае сэрца пацана**

**26 кастрычніка ў клюбе «Гудвін»** пройдзе прэзэнтацыя альбому «Розавы закат» гурту «Разьбітае сэрца пацана». Квіткі 15 000—20 000. Даведкі па т.: (029) 649-08-88.



PHOTO.BYMEDIA.NET

## ВЫСТАВЫ

**Тацяна Радзівілка і Канстанцін Селіханаў**

Іх выстава працуе **ў менскай мастацкай галерэі «Ла-Сандр-арт»**. Гэта адметныя творцы нашага часу. Мастакі — творчая сямейная пара. Намеснік старшыні Беларускага саюзу мастакоў Рыгор Сітніца сказаў: «Я б вельмі хацеў, каб такі аб'ект, як пластычная кампазыцыя Канстанціна Селіханава «Аркестар» (твор уяўляе зь сябе калёну, складзеную зь пяці статуяў музыкаў духавога аркестру, якія стаяць адзін на адным. — БелаПАН.) упрыгожвала праспект Незалежнасьці каля будынку цырку». Паводле яго меркаваньня, упрыгожваць сталіцу павінны ня толькі «Паштальён з газэтамі» і «Баба Камарыха», якая гандлюе семкамі. **Выстава працуе да 11 кастрычніка.**

**Колер 50-х**

**У фае Менскай гарадзкой цэнтральнай публічнай бібліятэкі імя Я.Купалы (В.Харужай, 16)** Беларускі архіў кінафотадакумэнтаў прэзэнтуе выставу «Колер 50-х», на якой можна ўбачыць афіцыйную фатахроніку 50-х гадоў ХХ стагодзьдзя.

**Тэхна-арт**

**У мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 11 кастрычніка** працуе выстава з сэрыі праекту «Тэхна-арт», на якой прэзэнтуюцца творы Ўладзімера Цэсьлера, Вадзіма Качана, Андрэя Шчукіна і іншых. Накірунак экспазыцыі: 3D-анімацыя, кампутарная графіка, лічбавы мантаж, жывапіс, арт-аб'екты.

**ФотаМастацтва**

**Да 26 кастрычніка ў Музэі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47)** працуе выстава твораў нямецкіх творцаў «ФотаМастацтва»

**Беларускія мастакі ў Беластоку**

**Да 12 кастрычніка ў беластоцкай галерэі «Арсэнал»** ідзе першарадная выстава твораў беларускіх мастакоў. Яе куратары — Тацяна Бембель, Артур Клінаў і Лена Прэнц — выбралі для паказу творы Вольгі Сазыкінай, Уладзімера Цэсьлера, Сяргея Ждановіча, Аляксея Фёдарава. Ігара Саўчанкі, Яні Грак. Аляксандра Камарова і групы Revision (Андрэя Дурэйкі, Андрэя Камарова, Максіма Тымінкі і Максіма Вакульчыка). Прэзэнтаваныя таксама творы Івана Базака і Аксаны Гурыновіч.

**Вокны Менску. Адлюстраваньне**

**Да 22 кастрычніка ў Мастацкім музэі** працуе выстава фотамастака Георгія Ліхтаровіча «Вокны Менску. Адлюстраваньне».

**Па мясьцінах Адама Міцкевіча**

**У музэі гісторыі беларускай літаратуры (Багдановіча, 15) да 18 кастрычніка** працуе фотавыстава «Па мясьцінах Адама Міцкевіча».

**Выстава да 120-годзьдзя з дня нараджэньня Дзекуць-Малея і Гадлеўскага.**

**Ад 12 да 17 кастрычніка** адчыненая выстава біблейскіх перакладаў на мовы ўсходнеславянскай групы «Біблія: мова, тэкст, гісторыя». Выстава праходзіць **у памяшканні Царквы Хрысціян Адвентыстаў Сёмага Дня па адрасе: вул. Васняцова, 32.**

## ФУТБОЛ

# БАТЭ—«Зэніт»

**Гульня пройдзе 21 кастрычніка (аўторак) у Санкт-Пецярбургу на стадыёне «Пятроўскі». Пачатак у 19.30, паводле менскага часу.**

У Пецярбург можна даехаць цягнікам **Варшава — С.-Пецярбург** (з п.104/20). Адпраўленьне зь Менску **20 кастрычніка ў 11.01.** У Санк-Пецярбург цягнік прыбывае ў 6.23.

52 цягнік **Менск — С.-Пецярбург «Звязда» адпраўляецца ў 17.40.** Прыбывае ў 8.52, і 50 цягнік Берасьце — С.-Пецярбург хуткі ад'яжджае зь Менску ў 18.48 прыбывае ў Санкт-Пецярбург у 9.40.

**Аўтобусам: адпраўленьне з Усходняга вакзалу 20 кастрычніка а 17-й.** Прыбыцьцё ў Санкт-Пецярбург у 9.40 21 кастрычніка.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**10 (пт)** — «Ядвіга»
**11 (сб)** — «Маэстра»
**12 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока»
**13 (пн)** — «Ромул Вялікі»
**14 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**15 (ср), 16 (чц)** — «Пінская шляхта»
**17 (пт)** — «Слуга двух гаспадароў»
**18 (сб)** — «Вечар»
**19 (ндз)** — «Памінальная малітва»

*ранішія спэктаклі*

**12 (ндз)** — «Паўлінка»
**19 (ндз)** — «Афрыка»

*малая сцэна*

**18 (сб)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**11 (сб)** — «Адэль»
**12 (ндз)** — «Казачкі з куфэрачка»
**12 (ндз)** — «Чорны квадрат»
**14 (аўт)** — «Адвечная песьня»
**15 (ср)** — «Неба ў дыямэнтах»
**16 (чц)** — «Карусель»
**19 (ндз)** — «Дамавічкі»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Па прачытаньні спаліць

**Па прачытаньні спаліць** (Burn After Reading)

ЗША — Францыя — Вялікабрытанія, 2008, каляровы, 96 хв.

**Рэжысёры:** Этан і Джоэль Коэны

**Ролі выконваюць:** Джон Малкавіч, Фрэнсіс МакДорманд, Джордж Клуні, Брэд Піт, Цільда Суінтан, Рычард Джэнкінз

**Жанр:** Іранічная драма

**Адзнака:** 7 (з 10)

Звольнены за алькагалізм агент ЦРУ (Джон Малкавіч), які «ўсё жыцьцё змагаўся з дэбіламі», вырашае скласьці мэмуары. Дыск зь ягонымі ўспамінамі трапляе ў рукі прыдуркаватых супрацоўнікаў сілоўні (Брэд Піт і Фрэнсіс МакДорманд), якія прагнуць узбагачэньня…

Стужка братоў Коэнаў — іранічны камэнтар на шпегаўскія фільмы, змовы й нікому не патрэбныя таямніцы. Фільм з абсурднай стрыманасьцю паказвае звычайных людзей, ахопленых сваімі жарсьцямі. Агент Джон Малкавіч — ільне да бутэлькі й патрыятычна брыдкасловіць. Ягоная жонка (Цільда Суінтан) — «халодная сьцерва» — здраджвае яму (і, рэжысёрскі зьдзек — працуе дзіцячым лекарам). Дробны целаахоўнік-плэйбой (Джордж Клуні) употайкі майструе пікантнае крэсла, а глупства спартовых інструктараў — Брэда Піта й Фрэнсіс МакДорманда — вымярэньню не паддаецца.

Знакамітыя акторы неглямурна-ідыятычныя, жыцьцярадасна-гратэскныя — і аднамерна-спустошаныя. З разьвясёлай усьмешкай Брэд Піт атрымлівае кулю ў лоб, Фрэнсіс МакДорманд трызьніць пластычнымі апэрацыямі, Джон Малкавіч бярэ ў рукі сякеру, а зьляканы Джордж Клуні ўцякае ў Вэнэсуэлу.

Але за іранічным аповедам і ахайна-цытатнымі кпінамі дасьціпнай драмы — нуда і драбнеча жыцьця, што адмаўляецца быць сапраўдным і заўжды ня тое, якім здаецца.

**Андрэй Расінскі**

# Ай хэў э дрын. Гумовы дрын

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Найлепшым спосабам засьведчыць беспрэцэдэнтны прагрэс Беларусі на шляху дэмакратызацыі было б уручэньне прэміі Сахарава вядомаму сілавіку, якога днямі адправілі ў адстаўку. Нават уявіў яго афіцыйную прамову ў Эўрапарлямэнце з гэтай нагоды. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Шаноўнае спадарства, дзякуй!

Вельмі прыемна атрымаць гэтую прэмію, якую ўручаюць тытанам барацьбы за правы чалавека. Зь іншага боку, як не глядзі, гэта абсалютна дастойная ацэнка маёй дзейнасьці. Усё, у чым мяне абвінавачваюць, было ня чым іншым, як пасьлядоўнай барацьбой за ўнівэрсальныя правы і годнасьць чалавечай асобы.

Возьмем, напрыклад, разгон дэманстрацыі на Дзень Волі ў 2006-м. Для мяне і байцоў маёй каманды не існавала дыскрымінацыйных забабонаў — разганяць апазыцыянэраў пэўнага полу, нацыянальнасьці, пэўнай сэксуальнай арыентацыі... Зуб даю — у мяне б з гаўптвахты не вылазіў баец, які б паспрабаваў запярэчыць, накшталт: «Таварыш палкоўнік, давайце не ганяць вунь таго дэмакрата. Я падазраю, што яго прадзед — ня чысты беларус». Усе разагнаныя дэмакраты маюць быць для нас роўныя!

І ўвогуле — той разгон быў з нашага боку чынам, вартым Махатмы Гандзі. Як і ў вялікага Гандзі, у нас былі толькі палкі. І нашых апанэнтаў мы таксама схілялі да ўжываньня аднаго з падставовых мэтадаў гандзізму — сядзячай забастоўкі. І нават транспартавалі іх у месцы, дзе ім ніхто не перашкодзіў бы баставаць. Каго на 10, каго на 15 сутак.

Прынцыповае, калясальнае значэньне мае для нас права людзей на выбар. Памятаю іншы майстар-кляс па гандзізму, праведзены намі з удзельнікамі намётавага лягеру на Кастрычніцкай плошчы. Кожнаму, хто не жадаў ехаць у месца сядзячай забастоўкі, мы далі права самастойна абраць — адзін раз з нагі або пяць фофанаў у аўтазак... камфартабэльным лімузіне.

Мы стаім на варце такіх інстытутаў, як права на таямніцу перапіскі — мае арлы амаль не чытаюць!

Нарэшце мы ня толькі пасьлядоўныя абаронцы х'юман райтс: мы самыя вялікія прапагандысты Дэклярацыі правоў чалавека. Прысуджаныя да году, двух, трох гадоў сядзячай забастоўкі апазыцыянэры нясуць суседзям па «зоне» інфармацыю пра тое, што ўсе людзі маюць правы на справядлівы суд.

Пры канцы дазвольце вас пераканаць — нашыя сілавыя структуры і надалей будуць стаяць на варце дэмакратыі. Галовы нашых ваяроў, аб якія разбіваецца нават цэгла — сьціплая ілюстрацыя маналітнасьці перакананьняў.

І закончыць я хацеў бы словамі вялікага змагара за правы чалавека Марціна Лютэра Кінга: «Ай хэў э дрын!». Прычым у адрозьненьні ад Кінга ня проста дрын, а дрын — гумовы. Пераеду па нырках — мала не падасца.

Дзякуй!

А цяпер пляскаць! Я сказаў пляскаць!.. Вось так!

Яшчэ раз дзякуй!

## КУДЫ МЫ ПРЫЕХАЛІ?



Аздабленьне аўтобуснага прыпынку ля Юравіч (Гомельшчына).

ЮРАСЬ УНУКОВІЧ

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПАДЗЯКА

**Шчыры дзякуй** Алесю Мазаніку, Адаму Шостаку, Валер'ю, Ігару К., Міхаілу С., Уладзімеру Ж., Юр'ю Т., Івану С., іншым сябрам за падтрымку падчас хваробы на набыцьцё лекаў. АК

### ПРАЦА

**Выкладчык** беларускай мовы жадае выкладаць (і вывучаць) беларускую мову ў любым населеным пункце сьвету. Т.: 294–13–38, з 21.00 да 22.00

### ЖЫТЛО

**Тэрмінова здам** дагледжаную трохпакаёвую кватэру ў раёне вул.Маякоўскага добрым і сумленным людзям прыблізна на год. Кошт 500 $ + камунальныя паслугі. Т.: (029) 607–92–24. Надзея

**Пара шукае** жытло ў Менску ці Менскім раёне: 1—2–пакаёвую кватэру, хату ці частку (з выгодамі). Т.: (029) 633–42–34. Базыль

**Здыму** аднапакаёвую кватэру ў Менску. Т.: (029) 704–00–18

### СУПОЛЬНЫЯ МАЛІТВЫ ЗА БЕЛАРУСЬ

**Малітвы адбываюцца** ў першы аўторак кожнага месяца а 20–й у капліцы рыма–каталіцкай парафіі Аўгустовак (вул.Рэпіна). Пад адным дахам зьбіраюцца каталікі, пратэстанты, праваслаўныя, уніяты, каб разам маліцца за нашы сем'і, нашы цэрквы, за горад і краіну. Далучайцеся!

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

### Дзякуй

**І.Н., Алегу М., Валянціне М.** з Гомелю.
**Юрасю Ч.** з Мазырскага раёну.
**Анатолю С.**, Тадэвушу Ш. з Маладэчанскага раёну.
**Аляксандру П.** з Жлобінскага раёну.
**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.
**Канстанціну С., Яўгеніі К., Васілю К., В.Ц., Галіне Л.** зь Віцебску.
**Уладзіславу М.** з Калінкавіцкага раёну.
**Георгію С., Ігару Б.** з Воршы.
**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.
**Вользе Ж.** з Барысаўскага раёну.
**П.С., Натальлі Б.** з Горадні.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

На ўпраўленьне дзяржавай (на ўтрыманьне розных праўленьняў, міністэрстваў, чыноўнікаў) — ідзе па 23 руб. 10 кап. з кожнай сотні. Пры такіх вялікіх выдатках неяк маркотна выглядаюць тыя 12 руб. 60 кап., што казна выдзяляе з сотні рублёў расходу на іншыя народныя патрэбы, як, напрыклад, прасьвета народу і др.

**«Наша Ніва». №21. 9 (22) кастрычніка 1908**

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 08.10.2008.
Замова № 5564.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.